WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЛІСТАПАДА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 214 (27078)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СТВОРАНЫ ФОНД ЖЫЛЫХ ПАМЯШКАННЯЎ КАМЕРЦЫЙНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ

**Адпаведны ўказ № 512 «Аб некаторых пытаннях выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду» 8 лістапада падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

«Гэтым указам прадугледжана стварэнне фонду жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду з ліку свабодных (вызваленых) жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, а таксама набытых, пабудаваных (рэканструяваных) жылых дамоў спецыяльна з гэтай мэтай», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Пры гэтым фінансаванне будаўніцтва (рэканструкцыі), набыцця жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання плануецца ажыццяўляць за кошт бюджэтных сродкаў, сродкаў, атрыманых ад здачы жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Указам прадстаўляецца права на атрыманне жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання грамадзянам, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама якія не знаходзяцца на такім уліку.

Жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання не падлягаюць абмену, падзелу, продажу або прыватызацыі, а таксама здачы па дагавары паднайму.

Ва ўказе вызначаны парадак уключэння жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ў склад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, парадак прадастаўлення жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання, аплаты за карыстанне такім жылым памяшканнем і за жыллёва-камунальныя паслугі, парадак заключэння дагавора найму жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання і парадак высялення з яго.

Памер платы за карыстанне жылымі памяшканнямі камерцыйнага выкарыстання будзе вызначацца зыходзячы з памеру базавай стаўкі платы за карыстанне такімі памяшканнямі, якая ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Беларусі, з прымяненнем каэфіцыентаў, вызначаемых аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам у залежнасці ад месца знаходжання жылога памяшкання.

Сродкі, атрыманыя ад здачы жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, будуць накіроўвацца на будаўніцтва або рэканструкцыю такіх памяшканняў. Гэта мера дасць магчымасць пастаянна павялічваць дзяржаўны жыллёвы фонд для здачы па дагаворах найму жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Тым самым будуць забяспечаны акупнасць затрат на стварэнне фонду і вяртанне бюджэтных сродкаў.

Акрамя таго, стварэнне такога фонду будзе ў вядомай ступені садзейнічаць вырашэнню жыллёвай праблемы грамадзян.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ОРДЭНА МАЦІ ЎДАСТОЕНЫ 20 ШМАТДЗЕТНЫХ ЖАНЧЫН З РОЗНЫХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ

**За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей ордэнам Маці ўзнагароджаны 20 шматдзетных жанчын з Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Адпаведны ўказ 8 лістапада падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Сярод узнагароджаных — аператар машыннага даення сельгаспрадпрыемства «Ельск» Ельскага раёна Наталля Гельвіх, майстар цэха ААТ «Гомельдрэў» Надзея Пятрэнка, работніца ААТ «Гроднажылбуд» Людміла Кірэй, інжынер-тэхнолаг ААТ «Саюзпрамтэхмантаж» Ірына Эйсмант.

## БЕЛАРУСЬ ПА ІНДЭКСЕ ЧАЛАВЕЧАГА РАЗВІЦЦЯ АПЯРЭДЖВАЕ КРАІНЫ СНД

**Беларусь па індэксе чалавечага развіцця апярэджвае ўсе краіны СНД і займае 65-е месца сярод 187 краін свету. Аб гэтым паведаміў прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніус Брук на прэзентацыі Даклада аб чалавечым развіцці за 2011 год, перадае БЕЛТА.**

Становішча Беларусі ў рэйтынгу стабільнае на працягу пяці гадоў і гэта добрае дасягненне, падкрэсліў Антоніус Брук. У колькасным выражэнні індэкс чалавечага развіцця з 2005 па 2011 год вырас з 0,723 да 0,756 — на 5 працэнтаў, або на 0,8 працэнта ў сярэднегадавым вылічэнні.

Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця. У гэтай жа групе краін Расійская Федэрацыя — на 66-м месцы, Казахстан — на 68-м, Грузія — на 75-м, Украіна — на 76-м, Арменія — на 86-м, Азербайджан — на 91-м. З краін былога Савецкага Саюза Малдова ўвайшла ў трэцюю групу краін з сярэднім узроўнем чалавечага развіцця і займае 111-е месца, а прыбалтыйскія дзяржавы — у групу краін з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця (Эстонія — на 34-м месцы, Літва — на 40-м месцы, Латвія — на 43-м месцы).

## 55 лепшых беларускіх тавараў у Расійскай Федэрацыі

*Лаўрэатамі конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» стала прадукцыя 55 беларускіх арганізацый*

**Найбольшая колькасць лаўрэатаў прадстаўлена ў намінацыі «Харчовыя тавары» — 22 арганізацыі. 21 пераможца вызначаны ў намінацыі «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння» і 12 лаўрэатаў — у намінацыі «Прамысловыя тавары для насельніцтва».**

Сярод лепшых харчовых тавараў — шырокі асартымент малочных прадуктаў, каўбасных вырабаў, а таксама кансервы з гародніны, кандытарскія вырабы, сухія кашы для дзіцячага харчавання. Спектр лепшай прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння ўключае керамічныя блокі, станкі, жалезабетонныя вырабы, портландцэмент, святлатэхнічныя вырабы, лінзы і гатак далей. Сярод пераможцаў прамысловых тавараў для насельніцтва — мэбля, трыкатажныя і дывановыя вырабы, абутак, сталовы посуд, тканіны...

Трэба патлумачыць, што адной з умоў удзелу ў конкурсе з'яўлялася экспарт беларускіх тавараў на расійскі рынак на працягу не менш за год. Па выніках конкурсу ў чарговы раз лаўрэатамі сталі Беларускі металургічны завод, Беларускі цэментны завод, ААТ «Савушкін прадукт», Віцебскі мясакамбінат, Пастаўскі малочны завод, ААТ «Малочны Мір», «Світанак», СТАА «Марка», ААТ «Слонімм эбля» і іншыя, што сведчыць аб высокай якасці і канкурэнтаздольнасці іх прадукцыі. Упершыню ўдзельнічалі ў конкурсе і сталі яго пераможцамі Бярэзінскі сыраробны завод, брэсцкае ЗТАА «Вастэга», сталічнае ТДА «Беллесвыраб» і СЗАТ «ФІДМАШ».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЗАЛАТАЯ ЗАВІРУХА Ў БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## БЕЛАРУСКІ ПАКОЙ

### *9 лістапада пісьменнікі на чале з Мікалаем Чаргінцом працягнулі свае падарожжа па Мінскай вобласці*

Чысцінскай сельскай бібліятэцы ў Маладзечанскім раёне празаікі і паэты падарылі свае кнігі. Наогул, у бібліятэцы даволі вялікі выбар беларускай літаратуры. Кнігі Максіма Багдановіча, Рыгора Барадуліна і нават кніжачка Уладзіміра Конана «Святло паэзіі і лірыка жыцця» пра лірыку Багдановіча. Праўда, фармуляры кніг амаль пустыя. Гэта, вядома, натхніла на самотныя думкі пра незапатрабаванасць беларускага слова. Але загадчыца Чысцінскай сельскай бібліятэкі паспрабавала гэта аспрэчыць.

— Дзесьці 40% усіх чытачоў з задавальненнем чытаюць беларускую літаратуру па-беларуску, — распавядае Наталля Васільеўна. — Калі добры твор, то беларуская мова зусім не адштурхоўвае чытача. Нядаўна наша бібліятэка пераехала ў новы выдатны будынак, і цяпер у нас ёсць магчымасць ладзіць літаратурныя імпрэзы. Днямі якраз у нас адбудзецца мерапрыемства, прысвечанае 120-годдзю з дня народзінаў Максіма Багдановіча.

У пасёлку Чысць пісьменнікі наведалі выдатны дзіцячы садок, які, дарэчы, удзельнічае ў абласным конкурсе на найлепшую дашкольную ўстанову. Такі дзіцячы садок, напэўна, ёсць не ў кожным буйным горадзе ў Беларусі. Басейн, пакой для рэлаксацыі, шыкоўная спартыўная зала і шмат чаго іншага. У садку зараз 138 выхаванцаў. Цікава, што тут ёсць свой «беларускі пакой».

У заключны дзень паездкі па Мінскай вобласці пісьменнікі наведалі і горад Маладзечна, які часам называюць культурнай сталіцай Мінскай вобласці. У прыватнасці, мясцовы культурна-забаўляльны цэнтр, парк імя Перамогі, амфітэатр, які пабудавалі да сёлетніх «Дажынак», і іншыя выдатныя мясціны горада. Але, відаць, самым цікавым стала наведванне Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага і Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча.

Намеснік дырэктара бібліятэкі Таццяна Чаброўская распавядае, што сёння дзеці неахвотна чытаюць не толькі беларускую літаратуру. Прычым наогул дрэнна чытаюць.

— Яны аддаюць перавагу камп'ютарам, інтэрнэту, — лічыць Таццяна Сцяпанаўна. — Але дзеці мала чытаюць беларускіх кніг яшчэ і таму, што не шмат іх сёння выдаецца. Асабліва беларускамоўных. Адпаведнае ў іх і паліграфічнае выкананне. Што, безумоўна, і дзяцей не прываблівае. І яны аддаюць перавагу або інтэрнэту, або прыгожым расійскім кнігам на мелаванай паперы.

У Маладзечанскай бібліятэцы шмат беларускіх кніг. Я адшукала нават «Каласкі» Зоські Верас выдання 1981 года з ілюстрацыямі Міхася Басалыгі. І шмат чаго іншага. Кнігі Віталя Вольскага, Алега Лойкі, напрыклад. Але выклікае самоту вось што: фармуляры асобнікаў амаль не запоўнены... А значыць, большасць часу кнігі праводзяць не ў руках чытачоў, а на бібліятэчных паліцах.

Што ж можа вярнуць цікавасць да беларускай літаратуры? Нават сучаснага афармлення, добрай паліграфіі можа быць недастаткова. Безумоўна, патрэбна нешта большае.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

## Учора яшчэ гулялі з лісцем, а сёння ўжо і мокры снег

Як паведамілі рэдакцыі ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры, сёння ўдзень ападкаў амаль не будзе, толькі на паўднёвым усходзе магчымы мокры снег. Уначы чакаецца ад 0 да 6 градусаў марозу, а ўдзень — 1—6 цяпла. Праўда, бліжэй да выхадных уначы стане яшчэ халадней, калі пры праясненнях пачне падмарожваць да мінус 6—8 градусаў. А ўдзень зноў плюс 1—6. На выхадныя ўдзень холадна, але без ападкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МІНГАРВЫКАНКАМ ПРАПАНУЕ ПАВЫСІЦЬ ТАРЫФЫ ЖКГ

**МІНГАРВЫКАНКАМ прапануе павысіць тарыфы для насельніцтва на тэхнічнае абслугоўванне і капітальны рамонт жылых дамоў на 60% — з 350 да 560 беларускіх рублёў за 1 кв.м.**

Як заявіў генеральны дырэктар ДВА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Раянтовіч, сабекошт капрамонту 1 кв.м сёлета ў студзені—верасні раўняўся 514 000 беларускіх рублёў, а тарыф для насельніцтва на тэхабслугоўванне 1 кв.м агульнай плошчы жылога памяшкання ў месяц складае 350 рублёў пры сабекошце 1081 рубель. І калі палічыць выдаткі на 1 кв.м капітальнага рамонту па сённяшнім тарыфе, то яны будуць пакрыты насельніцтвам толькі праз 122 гады.

Таксама Мінгарвыканкам прапануе Міністэрству ЖКГ і ўраду павялічыць тарыфы на бягучае ўтрыманне жыллёвага фонду прапарцыйна даходам насельніцтва. У прыватнасці, адысці ад субсідавання дзяржавай утрымання жыллёвага фонду, павысіць тарыфы; а той частцы насельніцтва, якая з-за нізкіх даходаў не зможа іх аплачваць, прадастаўляць сацыяльную адрасную дапамогу. Да слова, такая дапамога аказваецца і цяпер.

### ДАРЭЧЫ

*Напярэдадні зімы, якая абяцае быць суровай, мінскія камунальнікі запэўніваюць, што холадна ў сталічных кватэрах не будзе. І хоць сістэмы ацяплення нашых жылых дамоў разлічаны на тэмпературу да 23 градусаў марозу, выкананыя рэканструкцыя сістэм цэнтральнага ацяплення, а таксама ўсталяваныя сістэмы рэгулявання ў жылых дамах дазваляюць забяспечваць санітарныя нормы і пры больш нізкіх тэмпературах. Гарантавана не замерзнуць жыхары дамоў, у якіх праведзена цеплавая мадэрнізацыя. Ва ўцепленых дамах каэфіцыент разлічваецца з забеспячэннем санітарных нормаў у кватэрах пры тэмпературы вонкавага паветра да мінус 40 градусаў.*

**Святлана БУСЬКО.**

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗАЎТРА СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ДА 40 ПРАЦЭНТАЎ

**Згодна з інфармацыяй прэс-службы Нацбанка, з 11 лістапада галоўны банк краіны павялічвае стаўку рэфінансавання адразу на 5 працэнтаў з існуючых 35 да 40 працэнтаў гадавых.**

У гэты ж дзень павялічваюцца працэнтныя стаўкі па аперацыях рэгулявання ліквіднасці. Так, працэнтныя стаўкі па двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці павялічаны да 60 працэнтаў гадавых, а па аперацыях зняцця ліквіднасці — да ўзроўню 30 працэнтаў гадавых.

Чарговае павелічэнне гэтых ставак павінна паспрыяць абмежаванню інфляцыйных працэсаў і стабілізаваць сітуацыю ў эканоміцы і фінансавай сферы, паведамілі рэдакцыі ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

### МЕРНЫЯ ЗЛІТКІ КАШТОЎНЫХ МЕТАЛАЎ МОЖНА НАБЫЦЬ І ЗА РУБЛІ

**Пасля пэўнай стабілізацыі на валютным рынку краіны Нацыянальны банк Беларусі зноў аднавіў продаж каштоўных металаў не толькі за долары, але і за нацыянальную валюту.**

Цяпер юрыдычным асобам (за выключэннем банкаў) і насельніцтву мерны злітак золата вагой 1 грам прапануецца за 71 долар, ці за 617 тысяч 700 рублёў. У гэтым выпадку долар важыць, як і на біржы, каля 8700 рублёў.

Мерны злітак вагой 10 грамаў каштуе 5 млн 811 тысяч 600 рублёў (668 USD), а кілаграм золата — 562 млн 89 тысяч 600 рублёў (64 608 USD).

Людзі з грашыма могуць набыць і мерныя сярэбраныя злiткі вагой 10 грамаў за 191 тысячу 400 рублёў (22 USD), а кілаграм гэтага каштоўнага металу мае цэннік 12 млн 66 тысяч 900 рублёў (1387 USD). Мерны злітак плаціны вагой 1 грам каштуе 643 тысячы 800 рублёў (74 USD), а самы вялікі плацінавы злітак вагой 500 грамаў прадаецца за 260 млн 886 тысяч 900 рублёў, ці амаль за 30 тысяч долараў. Да гэтага часу, прыкладна з сярэдзіны красавіка, Нацбанк прадаваў каштоўныя металы насельніцтву выключна за валюту.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У МІНСКУ «ХУТКАЯ» ЎЕХАЛА Ў НАВЕС НА ПРЫПЫНКУ ГРАМАДСКАГА ТРАНСПАРТУ



**Аварыя адбылася 9 лістапада каля 10 гадзін 45 хвілін, паведаміла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Савецкага раёна Марыя Дзьякава.**

Кіроўца 1979 г.н. на аўтамабілі «Фольксваген Пасат» рухаўся па вуліцы Якуба Коласа ў кірунку вуліцы Дарашэвіча. Насупраць дома № 8 кіроўца вырашыў развярнуцца і не заўважыў машыну хуткай дапамогі, якая ехала па трамвайных пуцях у спадарожным кірунку. Кіроўца службы 103 імкнуўся пазбегнуць сутыкнення — вывернуў руль улева і экстранна затармазіў. У выніку «хуткую» занесла — і яна ўехала ў навес на прыпынку грамадскага транспарту. На шчасце, медыцынская дапамога пасля ДТЗ нікому не спатрэбілася.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### 13 ЧАЛАВЕК АТРУЦІЛІСЯ МЯСАМ ДЗІКА

**У Гродзенскай вобласці 13 чалавек трапілі ў бальніцу з дыягназам «трыхінелёз» з-за ўжывання ў ежу заражанага мяса дзіка паведамілі БЕЛТА ў МНС Беларусі.**

Пацярпелыя, сярод якіх пяцігадовае дзіця і 15-гадовы падлетак, знаходзяцца на стацыянарным лячэнні ў Гродзенскай абласной інфекцыйнай клінічнай бальніцы. Іх стан ацэньваецца як здавальняючы. Акрамя таго, выяўлены яшчэ 15 чалавек, якія елі заражанае мяса. Ім назначана прафілактычнае лячэнне, за станам іх здароўя сочаць медыкі. Як удакладнілі ў МНС, прычынай масавага захворвання стала ўжыванне мяса дзіка, здабытага паляўнічымі ў вёсцы Камяністая Гродзенскага раёна.

Трыхінелёзам хварэюць драпежныя (сабакі, лісы), усёедныя (свінні, мядзведзі, грызуны) і іншыя жывёлы. Чалавек заражаецца пры ўжыванні сырога або недаваранага мяса заражаных жывёл. Трыхінелёз праходзіць цяжка і часта з сур'ёзнымі ўскладненнямі. Павышаецца тэмпература да 38-40 градусаў, з'яўляюцца слабасць, болі ў горле, пачырваненне вачэй, болі ў жываце, млоснасць, ацёкі на твары, галоўным чынам ацёкі павекаў. Каб пазбегнуць атручэння, рэкамендуецца ўжываць у ежу толькі тое мяса і мясапрадукты, якія прайшлі экспертызу, не спрабаваць на смак сыры фарш. Лічынкі трыхіны гінуць пры гатаванні на працягу 2,5 гадзіны, таўшчыня кавалка павінна быць не большай за 8 см. Мяса дзіка неабходна абавязкова даследаваць на трыхінелёз у ветэрынарнай лабараторыі рынку.

### НАСТАЎНІЦА АБАКРАЛА СВАІХ ВУЧНЯЎ

**Настаўніца геаграфіі ў Мінску выкрала фотаапараты ва ўласных вучняў. Пра гэта паведамілі ў Партызанскім РУУС.**

На адным з урокаў настаўніца прапанавала школьнікам прынесці фотаапараты, каб сфатаграфаваць вучэбны матэрыял. Але адразу пасля званка на перапынак жанчына выправадзіла дзяцей на калідор, каб, па яе словах, праветрыць клас, пасля чаго ўзяла з сумкі адной з вучаніц фотаапарат і перахавала яго. Аналагічным чынам выкрала яшчэ 2 камеры.

Бацькі школьнікаў заявілі ў міліцыю аб прапажы. Праваахоўнікі наведалі школу для гутаркі з настаўніцай, але тая, спаслаўшыся на вялікую занятасць, сказала, што сама з'явіцца на допыт крыху пазней. Высветлілася, што за гэты час жанчына наведалася дадому, узяла выкрадзеную фотатэхніку і перахавала яе ў камеры захоўвання магазіна непадалёк.

У міліцыі жанчына пад цяжарам доказаў прызналася. Як растлумачыла настаўніца, яна здзейсніла такі ўчынак таму, што трапіла ў цяжкае фінансавае становішча. Заведзена крымінальная справа за крадзеж, жанчыне пагражае да 4 гадоў пазбаўлення волі.

**БЕЛТА.**

### ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ СКАРАЦІЛІСЯ

**Па выніках кастрычніка золатавалютныя рэзервы Беларусі скараціліся на 84,8 млн долараў ЗША ў вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ, ці на 53,6 млн долараў у нацыянальным вызначэнні. На 1 лістапада ўзровень рэзерваў склаў 6,1734 млрд долараў у эквіваленце (па вызначэнні ССРД МВФ — 4, 631 млрд).**

«На аб'ём золатавалютных рэзерваў паўплывала поўнае пагашэнне знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце Нацыянальным банкам і ўрадам на суму каля 287,8 млн долараў у эквіваленце, а таксама дынаміка цэн на каштоўныя металы на міжнародным рынку», — патлумачылі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## Курс беларускага рубля знізіўся

**Учора на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар падаражэў на 90 рублёў, еўра — на 150, а расійскі рубель — на 7.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 9 ЛІСТАПАДА**

**«Белінвестбанк»:** долар ЗША — 8650 і 8850; еўра — 11850 і 12200; расійскі рубель — 275 і 300.

**«Дэльта Банк»:** долар ЗША — 8600 і 8900; еўра — 11700 і 12300; расійскі рубель — 270 і 288.

**«Белгазпрамбанк»:** долар ЗША — 8660 і 8800; еўра — 11900 і 12120; расійскі рубель — 280 і 292.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КРЫЗІС ЕЎРАЗОНЫ ПАГРАЖАЕ ДЭСТАБІЛІЗАВАЦЬ СУСВЕТНЫ ФІНАНСАВЫ РЫНАК



**Крызіс еўразоны дасягнуў узроўню, калі ён пагражае дэстабілізаваць сусветны фінансавы рынак. Пра гэта заявіў новы кіраўнік Савета па фінансавай стабільнасці Марк Карні.**

«Крызісныя тэндэнцыі, якія развіваюцца ў зоне еўра, ствараюць небяспеку ўтварэння на сусветным фінансавым рынку глабальнай хвалі нестабільнасці, калі на рынку здольны ўзнікнуць недахоп ліквіднасці», — заўважыў Марк Карні, які з'яўляецца таксама кіраўніком Банка Канады. «Узрушэнні еўразоны распаўсюджваюцца на іншыя часткі сусветнай эканомікі, мы ўсё адчуем гэта ў самы бліжэйшы час, — папярэдзіў ён. — З адтокам ліквідных сродкаў з сусветнага фінансавага рынку на ім узмоцніцца нестабільнасць, што прывядзе да падзення актыўнасці. Гэта закране і рэальную эканоміку».

### НЯМЕЦКІЯ ЭКСПАРЦЁРЫ ГАТОВЫЯ АБЫСЦІСЯ БЕЗ ЕЎРА

**Нямецкія экспарцёры гатовыя абысціся без адзінай еўрапейскай валюты. Пра гэта заявіў кіраўнік Аб'яднання нямецкіх экспарцёраў BGA Антон Бернэр, перадае RTE. «Для нас важны свабодны рынак, а адзіная валюта неабавязковая. Ці ёсць жыццё ў Германіі пасля еўра? Так, ёсць», — заявіў Бернэр на сустрэчы з няўрадавай арганізацыяй «Асацыяцыя замежнай прэсы» ў Берліне.**

Пытанне пра выхад з еўразоны ў Германіі ўзнімалася ўжо неаднаразова. Паводле апытання, праведзенага ў верасні 2011 года, больш як палова немцаў хацелі б вярнуцца да нацыянальнай валюты.

### ЯПОНІЯ ВЫДАСЦЬ БЯСПЛАТНЫЯ ВІЗЫ Ў ФУКУСІМУ

**Замежныя турысты, якія збіраюцца наведаць тры найбольш пацярпелыя ад цунамі прэфектуры Японіі, атрымаюць візы бясплатна, паведамляе ВВС са спасылкай на японскі МЗС.**

Каб атрымаць бясплатныя візы, турысты, якія адпраўляюцца ў прэфектуры Міягя, Иватэ і Фукусіму, змогуць звярнуцца з 15 лістапада. Як паведамілі ў міністэрстве, гэтая мера разлічана на пяць гадоў. Такім чынам улады краіны разлічваюць павялічыць колькасць турыстаў, якая скарацілася на 30% пасля катастрафічных стыхійных бедстваў і аварыі на АЭС.

Нагадаем, раней паведамлялася, што ўрад Японіі мае намер выдаць бясплатныя авіябілеты 10 тысячам замежных турыстаў, якія вырашылі наведаць краіну ў перыяд з 1 красавіка 2012 па 31 сакавіка 2013 года.

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ НАЗВАЛІ МАБІЛЬНЫЯ ТЭЛЕФОНЫ «БОМБАЙ ЗАМАРУДЖАНАГА ДЗЕЯННЯ»

**Больш за 200 акадэмічных даследаванняў звязваюць выкарыстанне мабільных тэлефонаў з сур'ёзнымі праблемамі са здароўем, уключаючы ракавыя пухліны-гліёмы, піша The Daily Mail. Група брытанскіх навукоўцаў заявіла ў апублікаванай справаздачы, што ўрад недаацэньвае пагрозу для здароўя, якая зыходзіць ад прылад. Асабліва тэлефоны небяспечныя для дзяцей.**

Эксперты прапануюць школам, крамам, якія прадаюць тэлефоны, і сістэме аховы здароўя далучыцца да кампаніі, накіраванай на змяншэнне выкарыстання мабільных тэлефонаў. Адмыслоўцы нагадваюць: яшчэ ў 2008 годзе шведскія навукоўцы даказалі, што дзеці, якія выкарыстоўваюць мабільныя тэлефоны, у пяць разоў больш за астатніх рызыкуюць зарабіць гліёму. А іншыя навуковыя работы паказалі негатыўны ўплыў тэлефонаў на колькасць сперматазоідаў, на клеткі мозгу і на развіццё праблем з паводзінамі ў дзяцей, чые маці карысталіся падчас цяжарнасці мабільнікамі. Як адзначае адзін з аўтараў справаздачы Кевін О'Ніл, пухліна мозгу можа знаходзіцца ў латэнтным стане 30 гадоў. Так што рэальныя наступствы выкарыстання тэлефонаў яшчэ не відавочныя.



Увага!
Адкрыта падпіска
на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі
на І паўгоддзе 2012 года

Нашы паслугі па падпісцы:
- падпіска на абанементную скрыню
- падпіска на даму
- дастаўка да кватэры з уручэннем «з рук у рукі»
- падпіска праз Інтэрнэт
- магчымасць аплаты пры дапамозе пластыкавых картак
- прыём падпіскі па факсу для юрыдычных асоб

www.belpost.by

Падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у любым аддзяленні паштовай сувязі ці па тэлефонах у г. Мінску:
222-72-17, 293-55-95, 227-20-31

Брэсцкі філіял (8-0162) 200-804
Віцебскі філіял (8-0212) 476-139
Гомельскі філіял (8-0232) 715-342
Гродзенскі філіял (8-0152) 757-159
Мінскі філіял (8-017) 222-75-65
Магілёўскі філіял (8-0222) 310-882

БЕЛПОШТА

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲1 долар ЗША | 8 790,00 | 1 чэшская крона | 478,34 |
| ▲1 еўра | 12 110,00 | 1 польскі злоты | 2 779,14 |
| 1 латвійскі лат | 17 247,13 | ▲1 расійскі рубель | 292,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 510,31 | 1 украінская грыўня | 1 096,56 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,1033 |
| 10 UAH | 37,5540 |
| 10000 BYR | 34,6015 |
| EUR | 41,5998 |

## У ГРОДНЕ ПРАДАЮЦЬ ЖЫВЫХ ФАЗАНАЎ

ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» пачало рэалізацыю фазанаў для палявання, паведамілі БЕЛТА. Мясакамбінат выступіў з ідэяй разводзіць фазанаў у першую чаргу для арганізацыі палявання на іх. Першыя партыі птушак ужо рэалізаваны юрыдычным асобам, паляўнічым гаспадаркам. Таксама рэдкую птушку прадаюць юрыдычным асобам і грамадзянам для развядзення: кошт аднаго пеўніка складае Br130 тыс., курачкі — Br90 тыс. У сярэднім птушка важыць ад 700 г да 1,5 кг. Паляванне на фазана з даўніх часоў лічылася «каралеўскай забавай». Далікатэсам з'яўляюцца і стравы з птушкі. Яе пер'е прымяняюць у дэкаратыўных мэтах.

10 ЛІСТАПАДА 2011 г. ЧАЦВЕР № 32 (15683)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

## Ведай нашых!

### У хуткаснай радыётэлеграфіі роўных беларусам няма

**Нацыянальная зборная Рэспублікі Беларусь па хуткаснай радыётэлеграфіі на IX чэмпіянаце свету ў пяты раз запар заваявала званне чэмпіёна свету ў камандным заліку. У чэмпіянаце бралі ўдзел спартсмены з 20 краін. Зборная Беларусі, сфарміраваная са спартсменаў ДАСААФ, апярэдзіла зборную Расійскай Федэрацыі, якая заняла другое месца, на 610 ачкоў, а зборную Румыніі, якая фінішавала трэцяй, аж на 2160 ачкоў.**

У асабістым заліку беларускія спартсмены заваявалі 49 з 54 магчымых медалёў, у тым ліку 28 залатых, 15 сярэбраных і 6 бронзавых. У шматбор'і (па выніках чатырох практыкаванняў) беларусы заваявалі 14 медалёў (па 6 залатых і сярэбраных і 2 бронзавыя). З дзевяці ўзроставых катэгорый нашы спартсмены перамаглі ў шасці.

Ганна Шавяленка заваявала 5 залатых медалёў, у тым ліку і званне абсалютнай чэмпіёнкі свету сярод жанчын (дарэчы, ужо ў другі раз). А сярод мужчын званне абсалютнага чэмпіёна свету заваяваў беларус Сяргей Швядко (на яго рахунку 4 залатыя медалі). Ва ўзроставай катэгорыі да 16 гадоў у чэмпіянаце свету ўдзельнічалі брат і сястра Аляксей і Аляксандра Чаркасавы з Брэста. Абое заваявалі па чатыры медалі. У Аляксея ўсе ўзнагароды — залатыя, уключаючы медаль за перамогу ў шматбор'і. Да таго ж на рахунку беларускіх спартсменаў і сусветны рэкорд, які ўстанавіў у практычных практыкаваннях Станіслаў Гаўрыленка.

Трэба дадаць, што пачынаючы з 1995 года чэмпіянаты свету па хуткаснай рыдётэлеграфіі праводзяцца раз у два гады — па няцотных гадах, а па цотных праходзяць чэмпіянаты Еўропы. Беларускія радыёспартсмены перамаглі на чэмпіянаце свету ў 1997 годзе, а затым перамагалі пяць разоў запар — з 2003 па 2011 гады. Аднак сёлета і па колькасці заваяваных медалёў, і па іх вартасці яны нават палепшылі свой вынік двухгадовай даўніны.

У Беларусі радыёспорт развіваюць ДАСААФ і Міністэрства адукацыі (у дамах тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі). Займацца хуткаснай радыётэлеграфіяй можна ў любым узросце, пачынаючы з 6-7 гадоў. Для таго, каб дасягнуць у радыёспорце поспехаў, акрамя імгненнай рэакцыі і ўважлівасці, трэба мець таксама ўнікальную памяць, музыкальны слых і ўмець у самыя напружаныя моманты захоўваць «алімпійскі» спакой. Усе свае дзеянні спартсмены ажыццяўляюць на электронным ключы — маленькай скрыначцы са складанай электронікай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




На заўвагу!

# ЯК ПЕРАМАГЧЫ КАМП'ЮТАРНАГА ВОРАГА?

**У эпоху бурнага развіцця інфармацыйных тэхналогій камп'ютар успрымаецца як неад'емная частка нашага жыцця. Большасць сучасных дзяцей наогул не ўяўляе сабе без яго ні вучобу, ні вольны час і гадзінамі праседжвае сам-насам з «жалезным» мозгам.**

### З чым маем справу?

Вядома, што рызыкоўныя гульні (у тым ліку і камп'ютарныя) могуць выклікаць залежнасць, у чымсьці падобную на алкагольную ці нават наркатычную.

**Ірына Васільеўна Валабуева, педагог-псіхолаг,** расказала, чаму гульня займае значнае месца ў жыцці людзей: «Усё проста! З гульні ніхто не патрабуе вынікаў, там няма ніякай адказнасці! Калі падлетак у дзяцінстве не атрымаў у дастатковай форме прызнання, павагі, любові, то хутчэй за ўсё ён будзе імкнуцца атрымаць усё гэта ў гульні. Таму што ў гульні ён можа быць галоўным, яго ўсе слухаюцца, яго паважаюць, яго баяцца...»

### Калі ж трэба біць трывогу?

Можна вылучыць наступныя сімптомы камп'ютарнай гульнявой залежнасці:

- раздражненне чалавека, калі той гуляе ў камп'ютарную гульню і яго раптам клічуць кудысьці ці патрабуюць на нешта звярнуць увагу;
- чалавек, які шмат часу праводзіць за камп'ютарам, забывае пра хатнія справы, службовыя абавязкі, вучобу, сустрэчы і дамоўленасці
- чалавек зняважліва ставіцца да ўласнага здароўя, гігіены і сну на карысць правядзення большай колькасці часу за камп'ютарам;
- адчуванне эмацыйнага ўздыму падчас гульні.

**Асобна вылучаюць** фізічныя сімптомы. Гэта сухасць у вачах, галаўныя болі, боль у спіне, нерэгулярнае харчаванне, змяненне рэжыму сну.

«Калі падлетак атрымаў у камп'ютарнай гульні задавальненне, кайф, магчымасць выкіду эмоцый, — расказвае Ірына Васільеўна, — то ён будзе вяртацца сюды, каб атрымаць гэтыя пачуцці зноў. Гэта вельмі падобна на іншыя віды залежнасці: алкагольную і нават наркатычную. У гульні яны атрымліваюць рэальны кайф, не толькі псіхалагічны, але і фізічны. Гэта радасць, напруга...

Самыя небяспечныя наступствы залежнасці ад камп'ютарных гульняў — гэта змешванне рэальнасці і віртуальнасці аж да таго, што парушаецца самаідэнтыфікацыя. Падлетак губляецца... яму цяжка адрозніць, дзе ён, а дзе не ён.

Небяспека тут яшчэ і ў тым, што ў рэальным жыцці падлетак можа весці сябе як герой гульні. Калі ён любіць гуляць у агрэсіўныя гульні, то магчыма, выкарыстае такую мадэль паводзін і ў рэальнасці.

Найбольш да такой формы схільныя падлеткі, якія ў дзяцінстве не сфарміравалі павагу да бацькоў, давер... Калі гэты вакуум не запоўніўся раней, то ён запаўняецца з дапамогай камп'ютарнай гульні».

Так, напрыклад, у 2007 годзе адбылася бойка паміж удзельнікамі камп'ютарнай гульні Lineage 2, якая закончылася смерцю аднаго з юнакоў. 23-гадовы віноўнік сеў за забойства на восем гадоў. І гэта не адзіны такі выпадак.

Нават Андэрс Берынг Брэйвік, які ўстроіў двайны тэракт у Осла, у выніку якога загінула каля сотні маладых хлопцаў і дзяўчат, «трэніраваўся» ў гульні Modern Warfare 2, удасканальваючы тактычныя навыкі.

«Адной з галоўных праблем можна вылучыць дызадаптацыю, якая можа развіцца аж да таго, што пытанні жыцця і смерці для прыхільніка камп'ютарных гульняў перастаюць быць галоўнымі, бо калі ў гульні штосьці не атрымалася, ён можа перагуляць. А калі адно жыццё ён страціў, ёсць другое!», — мяркуе Ірына Васільеўна.

Атрымліваецца, што камп'ютарная мышка — гэта своеасаблівы аналаг чароўнай палачкі, дзякуючы якой практычна без намаганняў, ты становішся ўладаром свету.

Найбольш цікавымі і небяспечнымі для дзяцей з'яўляюцца ролевыя гульні, якія хутка фарміруюць залежнасць. Бываюць выпадкі, што ў некаторых псіхічна няўстойлівых падлеткаў, якія «прымяраюць» розныя віртуальныя вобразы, узнікаюць праблемы з самаідэнтыфікацыяй — узнікае адчужэнне «я», пачынаецца раздвойванне асобы па тыпе камп'ютарнай шызафрэніі.

### Як змагацца?

«Ведаеце, як бы гэта ні банальна гучала, але трэба з залежным чалавекам гаварыць, — лічыць Ірына Васільеўна. — Асаблівa гэта тычыцца бацькоў. Яны павінны расказаць пра свае пачуцці дзецям, пра перажыванні за яго. У гэтым выпадку, як мне здаецца, маралі і забароны не дапамогуць. Такія метады яшчэ могуць трошкі паўплываць на 11-12-гадовага геймера, аднак на падлетка 15-16 гадоў наўрад».

Парада карысная, аднак абмежаванне доступу да камп'ютара, як мне здаецца, у любым выпадку будзе неблагой справай! А калі і такія меры не даюць станоўчага выніку, то трэба абавязкова звяртацца да спецыялістаў, бо любая хвароба патрабуе спецыялізаванага лячэння, і залежнасць ад камп'ютарных гульняў не з'яўляецца выключэннем.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Імідж-стыліст Ірына ІЛЫНСКАЯ:

# «Лепш не насіць адзенне таго, кім ніколі не будзеш»



**«Падбірай думкі раніцай гэтак жа, як падбіраеш адзенне», — сказала гераіня аднаго замежнага фільма. Са сваімі думкамі кожны сам неяк разбярэцца (у большасці выпадкаў), а вось з адзеннем — складаней. Пра тое, ці ўмеюць нашыя жанчыны і дзяўчаты стыльна апранацца, што моднага прадаецца ў беларускіх універмагах і чаму чорныя празрыстыя калготкі лепш не насіць днём, расказала імідж-стыліст Ірына Ільінская.**

**— На тэлебачанні сёння шмат перадач, дзе паказваюць, як удала зменены імідж можа вырашыць шмат праблем у жыцці. Ці сапраўды гэткія цуды здараюцца альбо такое меркаванне — больш рэкламны прыём, каб стваральнікі моднага адзення і касметыкі не заставаліся без даходу?**

— Думка пра тое, што правільнае адзенне можа паспрыяць поспеху, сёння вельмі папулярная. Вядома, гэта шмат у чым рэклама. Несумненна, прыгожае адзенне, якое пасуе чалавеку і дазваляе яму адчуваць сябе «на вышыні», вельмі дапамагае, калі размова ідзе пра паляпшэнне настрою, напрыклад. Але калі праблемы ў жыцці чалавека маюць больш складанае паходжанне — толькі пераапрананнем справа тут не вырашаецца. Для грунтоўных змен у сабе неабходная і праца з псіхолагам, і ўнутраная праца над сабой. Дабіцца таго, пра што чалавек марыць, яму перашкаджаюць перш за ўсё ўнутраныя бар'еры, а знешнасць — гэта толькі дадатковая акалічнасць.

**— Ці шмат у вас кліентаў? Мабыць, гэта ў большасці сваёй вядомыя і забяспечаныя людзі?**

— Сёння паслугамі стыліста карыстаюцца не толькі багатыя людзі. Калі я пачынала працаваць у Беларусі, то сапраўды, кліенты былі пераважна людзьмі далёка не беднымі і прыходзілі для таго, каб паспрабаваць модную паслугу, — гэта проста было прэстыжна.

Цяпер жа зварот да стыліста — гэта зусім не нешта звышшыкоўнае. Прыходзяць беларусы і беларускі, якія жадаюць ведаць, што за адзенне ім пасуе, просяць дапамагчы ў пошуку вобраза, які падыдзе менавіта ім, каб выглядаць больш прывабна.

**— Беларускія жанчыны ўмеюць апранацца стыльна?**

— Калі выйсці на вуліцу і паназіраць за нашымі жанчынамі і дзяўчатамі, можна сказаць, што большасць арыентуецца толькі на знешні вобраз, забываючы пра неабходнасць унутрана гэтаму вобразу адпавядаць. Часцей за ўсё яны падбіраюць рэчы адну да адной, а не гэтыя самыя рэчы да свайго светаадчування. На жаль, выражэння сябе я бачу вельмі мала. А знешне ўсё выглядае зусім нядрэнна.

**— І якія ж галоўныя недахопы?**

— Першае, што адразу кідаецца ў вочы, — вялікая любоў нашых жанчын падбіраць сумку пад абутак, альбо шалік пад сумку, а то і ўсё разам. Зараз гэта зусім не актуальна. Колеры павінны быць ці з адной гамы (але не аднолькавыя), ці кантрасныя. Таксама многія беларускі любяць насіць чорныя празрыстыя калготкі на працягу дня, надзяваючы іх пад усё што заўгодна, — нават пад баваўняную летнюю сукенку. Па правілах, гэтыя калготкі лічацца прадметам вячэрняга гардэроба, а днём лепш выбіраць каляровыя непразрыстыя. А калі ўжо трэба чорныя, то таксама абавязкова такія, каб не прасвечваліся.

**— Сёння многія не так часта могуць дазволіць сабе абнаўляць гардэроб. Якія рэчы павінны быць у шафе, каб выглядаць больш-менш стыльна пры мінімальных выдатках?**

— Для жанчын — гэта дзелавы касцюм, спадніца-аловак, чорныя альбо бэжавыя штаны, маленькая чорная сукенка, белая кашуля, вадалазка, джэмпер і паліто класічнага пакрою. Гэтыя рэчы заўжды актуальныя і лёгка камбінуюцца, пасуюць амаль усім. Ну і, безумоўна, — сінія прамыя джынсы. Падчас крызісу сапраўды лепш набываць адзенне больш практычнае, а модныя дэталі ствараць з дапамогай аксесуараў — напрыклад, шалікаў, пальчатак, калготак, паясоў.

**— Дзе вы раіце людзям, што звяртаюцца, набываць адзенне — у дарагіх крамах альбо на рынку?**

— Напрыклад, турэцкія рэчы я не люблю. Хаджу ў брэндавыя крамы, не абавязкова самыя дарагія. Нешта знайсці можна і ў беларускіх універмагах. Набываю там часам пальчаткі ці сумкі, ну і адзенне таксама.

**— Імідж каго з вядомых беларусак ці беларусаў вы можаце пахваліць?**

— Ларыса Грыбалёва добра выглядае, Іна Афанасьева, Аня Шаркунова. Адразу відаць, што людзі над сваім іміджам працуюць.

**— У Беларусі ў элітных брэндавых крамах ніколі не ўбачыш натоўпу пакупнікоў. Але ж для чагосьці гэтыя крамы ўсё ж пабудаваны?**

— Тых, хто можа дазволіць сабе набываць рэчы сусветна вядомых брэндаў у Беларусі, вельмі мала. Цэны на адзенне, нават у параўнанні з Масквой і Кіевам, у нас вельмі завышаныя, а даходы нашмат ніжэйшыя. Атрымліваецца, што забяспечаным людзям больш выгадна свой гардэроб у Парыжы ці Мілане набываць, чым купляць рэчы гэтых жа марак у Мінску. Гэта адна з прычын таго, чаму модная індустрыя ў нас не развітая.

**— Ці можна па манеры апранацца вызначыць рысы характару чалавека?**

— Па адзенні, безумоўна, можна шмат зразумець пра чалавека. На адным семінары даводзілася ўдзельнічаць у цікавай гульні: з залы выходзілі людзі, а я па адным знешнім выглядзе павінна была скласці пра іх нейкае меркаванне. Многія былі, мякка кажучы, здзіўлены, калі даведваліся, якое ўражанне складваецца ад іх знешняга выгляду.

Усе колеры і формы ў падсвядомасці чалавека выклікаюць пэўныя асацыяцыі. Гэта як знакі для навакольных. Адна з дзяўчат, якая ўдзельнічала ў эксперыменце, вельмі пакрыўдзілася. Яна была апранута ў бэжава-карычневай гаме, што гаворыць пра імкненне асобы быць будзённай і непрыкметнай, менш звяртаць на сябе ўвагу. «Што вы, я не такая!» — аспрэчвала дзяўчына. Можа, і праўда, але ж чаму чалавек не задумваецца, што яго ўнутраны свет не адпавядае той знешняй інфармацыі, якую ён пра сябе паведамляе? Гэта ўжо гаворыць пра нейкія праблемы ва ўспрыняцці сябе.

**— Добра, а вось калі дзяўчына любіць насіць міні-спадніцы і калготы ў сетку, але пры гэтым — сама выхаванасць і зусім не адпавядае таму суб'ектыўнаму ўспрыняццю, якое ўзнікае з-за яе любові да такіх прадметаў гардэроба? Якія тут праблемы ва ўспрыняцці сябе?**

— Адразу напрошваецца вывад, што дзяўчына проста хоча прыцягнуць увагу супрацьлеглага полу, заявіць пра сябе як пра прывабную асобу. Толькі псіхолагі скажуць пра наяўнасць у гэтым выпадку няўпэўненасці ў сабе. Гэта вельмі дзіўна, але, як правіла, тыя, у каго такі агрэсіўны вобраз, больш няўпэўненыя, чым сціплыя дзяўчаты ў блузках.

**— Па чым можна вызначыць, які знешні вобраз будзе адпавядаць унутранаму?**

— У сваёй працы я, вядома, прыслухоўваюся да таго, што жадае кліент. Але вельмі часта бывае, што чалавек шмат эксперыментуе са сваёй знешнасцю, а так і не можа зразумець, што ж яму патрэбна. У такім выпадку неабходна задаць яму шэраг пытанняў, паразмаўляць, каб вызначыць, дзе чалавек сапраўдны. Амаль усе жанчыны, што звяртаюцца, хочуць атрымаць вобраз супрацьлеглы: сціплыя і вытанчаныя імкнуцца быць больш экстравагантнымі, а эфектныя і яркія хочуць апранацца ў шэрае. Даводзіцца тлумачыць, што лепш не насіць адзенне таго, кім ты ніколі не будзеш сябе адчуваць.

**ДАВЕДКА:**

*Ірына Ільінская, імідж-стыліст. Вывучала асновы стылістыкі і дызайну ў Маскоўскім універсітэце культуры і мастацтва, Інстытуце індустрыі моды, прыватнай студыі Любові Міхайлаўны Паповай. Супрацоўнічала з такімі моднымі часопісамі, як L'officiel (Украіна), Caprice (Крым), Alpha Woman і ЭШ (Беларусь). Працавала стылістам у Маскве, сёння мае сваю студыю моды і стылю ў Мінску.*

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

Пётр ЯЛФІМАЎ:

# «АЎТАБІЯГРАФІЯ, ПАКЛАДЗЕНАЯ НА МУЗЫКУ І ВЕРШЫ»

**Кожны канцэрт гэтага выканаўцы — адкрыццё, кожная песня — споведзь, кожная нота — чыстая. Колькі б супярэчнасцяў ні было вакол імя «Пётр Ялфімаў», адмаўляць напісанае вышэй бессэнсоўна! Пасля аднаго з канцэртаў у сталіцы, падчас якога Пётр выканаў як любімыя для слухачоў кампазіцыі з першага альбома, так і зусім новыя песні, у нас адбылася размова пра музыку... Тую, якая з глыбіні душы. І пра тое, што ў ёй, гэтай душы.**



**— Пётр, пасля канцэрта зал апладзіраваў вам стоячы. У чым сакрэт?**

— Мне здаецца, сакрэту няма. Проста я шчыра люблю свайго слухача, размову з ім, прычым усё роўна — пасродкам слоў ці музыкі. Я звяртаюся да яго з адкрытым сэрцам, не стаўлю паміж намі сцяну, інакш зусім не бачу сэнсу выходзіць на сцэну...

**— Ваша аўдыторыя слухачоў, якая яна?**

— Складана адказаць дакладна на гэтае пытанне *(усміхаецца)*! На сцэну выносяць кветкі дзеці гадоў чатырох — пяці, а не так даўно на канцэрце танцаваў дзевяностатрохгадовы мужчына. Думаю, выкананне самых розных песень — ад дастаткова экспрэсіўных рок-кампазіцый да лірычных балад — дае досыць шырокую і разнахарактарную аўдыторыю...

**— Сярод такой колькасці самых розных песень, можаце вылучыць любімую?**

— Ніколі не дзяліў кампазіцыі на больш ці менш любімыя, значныя, блізкія. Кожная з іх становіцца такой у залежнасці ад настрою, жыццёвай сітуацыі... І ўсе ж асаблівыя эмоцыі заўсёды адчуваю, калі выконваю песню «Ведаю, ты кахаеш», укладваю ў яе самыя шчырыя пачуцці. (Песню «Ведаю, ты кахаеш» Пётр прысвячае падчас канцэртаў сваёй каханай жанчыне, Таццяне Касмачовай. — **Аўт.**).

**— Што адбываецца ў творчым жыцці?**

— Я нядаўна зняўся ў кіно! Назва фільма — «Украсці Бельмандо». Там я француз і фатограф, маё хобі — крадзеж элітных жывёл *(смяецца)*! Акрамя таго, займаюся прадзюсаваннем групы «Aillion» і працую з моладзевым праектам «Трыкіта», салісты якога — дзеці 14—15 гадоў. Гэта Паліна Касмачова, Кацярына Жарына і Кірыл Ермакоў. Падобнага праекта ў нашай краіне яшчэ не было, слухачы ўжо прымаюць яго на ўра! Акрамя таго, я працягваю сваю працу за мяжой.

**— Ці не замінае такая занятасць выкладчыцкай дзейнасці?**

— Не, я пяты год выкладаю вакал у Інстытуце сучасных ведаў, і мне гэта вельмі падабаецца! Калісьці нават уявіць сабе не мог, што буду вучыць маладых людзей. А зараз яны прыязджаюць да мяне з розных гарадоў нашай краіны! Я адчуваю аддачу і іх давер, разумею: тое, што я раблю, насамрэч патрэбна. Гэта не можа не цешыць! Пры гэтым я і сам застаюся вечным студэнтам: у маім штодзённым графіку заняткі вакалам, эксперыменты са стылем, праца над сабой — стаяць на месцы не атрымліваецца!

**— Чаго чакаць хуткім часам слухачам?**

— Магчыма, цікавага дуэта. І, вядома, вось-вось сусвет зможа ўбачыць новы альбом (працоўная назва альбома — «Кніга адкрыццяў». — **Аўт.**). Мне складана неяк каментаваць канчатковы вынік, і я з павагай перадаю гэтую магчымасць слухачу. Усё, што магу сказаць, гэта — аўтабіяграфія, пакладзеная на музыку і вершы!..

**Паліна КУЗЬМІЦКАЯ.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает об изменении с 15 ноября 2011 года размеров следующих вознаграждений, взимаемых по операциям с использованием банковских пластиковых карточек банка:**

| Банковские пластиковые карточки Maestro, VISA Electron, БелКарт-М, БелКарт-М «Студенческая», БелКарт-М «Аграрная», БелКарт-М «Сберегательная» со счетом в белорусских рублях (для использования только в Республике Беларусь) | |
|---|---|
| Срочное оформление (перевыпуск, обновление, изготовление дубликата) карточки клиентам учреждений банка, расположенных в г. Минске, на следующий рабочий день после подачи заявления | 50 000 бел. руб. |
| **Международные микропроцессорные банковские пластиковые карточки VISA Electron стандарта EMV, VISA Electron стандарта EMV для женщин (Леди Карт) со счетом в белорусских рублях** | |
| Барысаў | 15-41 | 17-13 | штодня | усюды |
| Орша | 16-22 | 20-36 | штодня | усюды |
| Барысаў | 17-00 | 18-34 | штодня | усюды |
| Барысаў | 17-26 | 19-10 | штодня | усюды |
| Орша | 18-33 | 22-20 | штодня | б/п Выдзершчына, Пераваланчы, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў | 19-39 | 21-22 | штодня | усюды |
| Барысаў | 20-24 | 21-58 | штодня | усюды |
| Барысаў | 21-52 | 22-59 | штодня, акрамя суб. | з прыпынкамі Мінск-Усходні, Зарэчнае, Жодзіна-Паўднёвае, Печынскі |
| Барысаў | 22-25 | 00-06 | штодня | усюды |

***Расклад руху электрацягнікоў у зваротным накірунку чытайце ў суботу 12 лістапада.***

## Факт

### «НЕ ПРАСМАЛЬВАЙ СВАЁ ЖЫЦЦЁ!»

**Пад такой назвай 12 і 26 лістапада Мінскае абласное ўпраўленне МНС правядзе ва ўсіх раённых цэнтрах шырокамаштабную акцыю, мэта якой — змяншэнне колькасці пажараў і папярэджанне гібелі людзей ад іх.**

За 9 месяцаў гэтага года ў краіне адбылося больш за 6,3 тысячы пажараў, на якіх загінула 780 чалавек, у тым ліку 15 дзяцей. Асноўная прычына ўзнікнення пажараў і гібелі людзей — курэнне ў ложку ў стане алкагольнага ап'янення. У Мінскай вобласці ахвярамі агню стала 190 чалавек, у тым ліку двое маралетніх дзяцей...

У рамках акцыі пройдзе навучанне насельніцтва правілам пажарнай бяспекі, прафілактычныя гутаркі пра небяспеку курэння ў ложку, дэманстрацыя навучальных відэаролікаў і іншыя мерапрыемствы. Найбольш маштабна акцыя пройдзе ў Барысаве і Жодзіне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### УКРАЎ У ПРАДПРЫМАЛЬНІКА 15 МАБІЛЬНІКАЎ

**У Аршанскі гарадскі аддзел унутраных спраў па дапамогу звярнуўся індывідуальны прадпрымальнік. Ён паведаміў, што невядомы, разбіўшы вітрыннае шкло, украў 15 мабільных тэлефонаў са стэлажа, размешчанага ў гандлёвым цэнтры «Мустанг». Шкоду бізнэсмен ацаніў на суму звыш 8,3 мільёна рублёў.**

Супрацоўнікамі міліцыі было ўстаноўлена, што злачынства здзейсніў непрацуючы мясцовы жыхар 1982 года нараджэння.

### ПЕШАХОДЫ ГІНУЦЬ ПАД КОЛАМІ «ТРАНСПАРЦЁРАЎ»

**Паблізу вёскі Буда Дубровенскага раёна каля шасці гадзін вечара 55-гадовы жыхар Мінска, кіруючы мікрааўтобусам «Фольксваген Транспарцёр», наехаў на 51-гадовага жыхара вёскі Ступакі. Пешаход пераходзіў дарогу ў недазволеным месцы. Мужчына ад атрыманых траўмаў памёр на месцы здарэння. Святлоадбівальнымі элементамі пешаход пазначаны не быў.**

А каля вёскі Міхайлаўшчына Талачынскага раёна каля васьмі гадзін вечара 50-гадовы жыхар Талачына, таксама кіруючы мікрааўтобусам «Фольксваген Транспарцёр», пры сустрэчным раз'ездзе наехаў на 58-гадовага жыхара вёскі Старое Палюдава, які загінуў. Пры ім таксама не было флікера.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ШТО АДБЫЛОСЯ З ЖАНЧЫНАЙ У ВАННЫМ ПАКОІ?

**Грамадзянка 1963 года нараджэння была дастаўлена ў траўмапункт з апёкамі верхніх дыхальных шляхоў, тэрмічнымі апёкамі паверхні цела першай-трэцяй ступеняў плошчай 60 працэнтаў. Пра гэта ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паведаміла медсястра траўмапункта.**

Пры разборы здарэння было ўстаноўлена, што тленне адзення на жонцы гаспадара кватэры адбылося ў ванным пакоі. Як мяркуецца, прычынай узгарання стала спроба суіцыду. Пасля вывучэння рэчавых доказаў — адзення пацярпелай — была ўстаноўлена наяўнасць лёгкаўзгаральнай вадкасці, на лінолеуме ў ванным пакоі меліся прагары кропельнага выгляду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДАЎНО БРАГАЙ НЕ ПАХЛА

**У лесе каля в. Перасек (Камянецкі раён) супрацоўнікі Брэсцкай інспекцыі аховы расліннага і жывёльнага свету сумесна з мясцовымі міліцыянерамі знайшлі два стацыянарныя самагонныя апараты і 1,5 тоны брагі.**

У гэтым жа раёне пенсіянер з в. Расна выраблаяў гарэлку ў сваім доме. У яго канфіскавалі апарат, 260 літраў брагі і 2 літры гарэлкі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**
**25 ноября 2011 года**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЕ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ**
**по продаже имущества ОАО «Силуэт», обращенного в доход государства:**

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 100/С-47607 (хозпостройка) пл. 253,9 кв.м, летняя площадка, ворота и калитка металлические на кирпичных столбах, забор кирпичный сплошной с бетонным цоколем, деревья, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Кижеватова, 12 на земельном участке с кадастровым № 140100000001008693 пл. 0,1251 га (доля в праве постоянного пользования 389/1000). Начальная цена продажи 141 827 400 руб.

**Полная информация об аукционных торгах по тел.: (0162) 23 81 92, (0162) 23 18 13.**
**Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**на 9-секционный 11-19-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс – Блок А) по генплану № 1 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по пр. Дзержинского в г. Минске**

***Информация о застройщике:*** Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Синтез-Белнеп Строй», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 04 декабря 2003 года № 2057 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190501210.

Адрес: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18. Режим работы: Пн.–Пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Телефон: (017) 246 48 89. Факс: (017) 246 44 47. До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

***Информация о проекте строительства:***
Цель проекта строительства – строительство 9-секционного 11-19-этажного многоквартирного жилого дома со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс – Блок А) по генплану № 1.

Здание многоквартирного жилого дома запроектировано из 9 секций, общая площадь жилого здания 57 333,02 м². Количество жилых помещений (квартир) – 600, из них: однокомнатных – 114, двухкомнатных – 232, трехкомнатных – 220, четырехкомнатных – 20, пятикомнатных – 8, шестикомнатных – 6. Каждая секция оборудована мусоропроводом, двумя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (балконы и лоджии). В 2-, 3-, 4-, 5- и 6-комнатных квартирах ванные комнаты с естественным освещением. Конструкция здания – каркасно-монолитное сооружение. На 1-м этаже здания расположены встроенные помещения общественного и административного назначения общей площадью 3 459,66 м². В зоне верхнего технического этажа – мастерские творческих организаций общей площадью 1094,74 м². Количество машино-мест подземной гараж-стоянки – 135.

Многоквартирный жилой дом расположен по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, д. 131

**Начало строительства – февраль 2008 года.**
**Окончание строительства – первое полугодие 2012 года.**

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:

- государственную экспертизу (заключение РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» от 06.09.2007 № 1979-07 с дополнениями к заключению от 30.12.2008 № 3227-5/08; от 04.06.2010 № 399-15/10; от 03.01.2011 № 1781-15/10; от 28.03.2011 № 208-15/11);
- государственную экологическую экспертизу (заключение №158 от 11.06.2007).

Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску выдано разрешение на производство строительно – монтажных работ № 2-203Ж-015/08 от 31.03.2011 г.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 10,8623 га решениями Минского горисполкома от 15 ноября 2007 года № 2679, от 03.03.2011 № 516. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Свидетельства (удостоверения) № 500/141-3252 от 10.01.2008, № 500/141-3247 от 10.01.2008, № 500/141-3248 от 10.01.2008, № 500/141-3251 от 10.01.2008, № 500/141-3250 от 10.01.2008, № 500/1028-2025 от 11.05.2010 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

**Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к заключению договоров создания объектов долевого строительства 10 (десять) квартир:**

- однокомнатные – 2 (две) квартиры общей площадью (44,67; 44,6) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 9700000 (Девять миллионов семьсот тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;
- двухкомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью (70,98) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8900000 (Восемь миллионов девятьсот тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;
- трехкомнатные – 2 (две) квартиры общей площадью (84,91; 89,37) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8500000 (Восемь миллионов пятьсот тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;
- четырехкомнатных – 3 (три) квартиры общей площадью (121,88-140,45) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8300000 (Восемь миллионов триста тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;
- пятикомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью (149,2) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 7000000 (Семь миллионов) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;
- шестикомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью (166,06) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 7000000 (семь миллионов) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства.

**Для физических и юридических лиц предлагаются на 1-ом этаже к заключению договоров 3 нежилых помещения:**
помещение № 9 – общей площадью 212,27 м²;
помещение № 10 – общей площадью 199,34 м²;
помещение № 11 – общей площадью 210,18 м².

**К заключению договоров долевого строительства предлагаются творческие мастерские (5 нежилых помещений) общей площадью 28,85-36,4 м².**

**Для физических лиц предлагаются к заключению договоров создания объекта долевого строительства (подземной автостоянки) 10(десять) машино-мест (10 долей из 135 в праве собственности на подземную автостоянку) стоимостью за одно машино-место (1/135 доли в праве собственности на подземную автостоянку), 92 000 000 (девяносто два миллиона) белорусских рублей.**

Отделка квартир не выполняется. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находится в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи (за исключением, находящихся в них творческих мастерских и иных нежилых помещений общественного назначения) и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство парковки.

**Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства в эксплуатацию: первое полугодие 2012 года.**

Строительство многоквартирного жилого дома ведется застройщиком собственными силами.

Срок действия настоящей проектной декларации – до 17 декабря 2011 г.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18, или по телефонам: (017) 246 47 43; 246 48 89, 611 33 33 (velcom), на сайте www.dolevoe.by.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**на 25-этажный односекционный многоквартирный жилой дом (2-й пусковой комплекс – Блок Г) по генплану № 2 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по пр. Дзержинского в г. Минске**

***Информация о застройщике:***
Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Синтез-Белнеп Строй», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 04 декабря 2003 года № 2057, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190501210.

Адрес: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18. Режим работы: Пн.–Пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Телефон: (017) 246 48 89. Факс: (017) 246 44 47.

До настоящего проекта организация осуществляла функции заказчика на 9-секционный 11-19-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс – Блок А) по генплану № 1 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» в г. Минске.

***Информация о проекте строительства:***
Цель проекта строительства:
- строительство 25-этажного односекционного многоквартирного жилого дома (2-й пусковой комплекс -Блок Г) по генплану № 2.

Здание жилого односекционного многоквартирного 25-этажного дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения. Общая площадь жилого здания 15261 м². Количество жилых помещений (квартир) 144, из них: однокомнатных 24, двухкомнатных 48, трехкомнатных 69, четырехкомнатных 2, пятикомнатных 1; на первом этаже – офис общей площадью 127,0 м², кафе на 50 мест общей площадью 419,3 м². Секция оборудована мусоропроводом, двумя пассажирскими и двумя грузопассажирскими лифтами.

Многоквартирный жилой дом расположен по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, д.129.

**Начало строительства 2-го пускового комплекса (Блок Г) – февраль 2010 года. Окончание строительства – первое полугодие 2012 года.**

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:
- государственную экспертизу (заключение РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» от 06.09.2007 № 1979-07 дополнениями к заключению от 30.12.2008 № 3227-5/08, от 06.01.2010 № 2233-5/09);
- государственную экологическую экспертизу (заключение № 158 от 11.06.2007).

Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску выдано разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-015/08 от 31.03.2011 г.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 10,8623 га решением Минского горисполкома от 15 ноября 2007 года № 2679, от 03.03.2011 № 516. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Свидетельства (удостоверения) № 500/141-3252 от 10.01.2008, № 500/141-3247 от 10.01.2008, № 500/141-3248 от 10.01.2008, № 500/141-3251 от 10.01.2008, №500/141-3250 от 10.01.2008, № 500/1028-2025 от 11.05.2010 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

**Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к заключению договоров создания объектов долевого строительства 30 (тридцать) квартир:**

однокомнатных – 4 (четыре) квартиры общей площадью – (55,8) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 9300000 (Девять миллионов триста тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;

двухкомнатных – 9 (девять) квартир общей площадью – (67,7-72,2) м² . Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8800000 (Восемь миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;

трехкомнатных – 15 (пятнадцать) квартир общей площадью – (86,1-104) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8500000 (Восемь миллионов пятьсот тысяч) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;

четырехкомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью – (159,6) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 8000000 (Восемь миллионов) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства;

пятикомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью – (167,3) м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (10.11.2011 г.) составляет 7000000 (Семь миллионов) белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной на весь период строительства.

**Для физических и юридических лиц предлагается к заключению договора нежилое помещение для размещения кафе на 50 посадочных мест общей площадью 419,3 м².**

Жилые помещения объекта долевого строительства Застройщиком передаются без выполнения чистовых работ, с выполненными следующими видами работ:

простая штукатурка стен и/или без выполнения работ по оштукатуриванию стен при устройстве перегородок из гипса;
черновая стяжка полов;
гидроизоляция санузлов;
устройство системы отопления с установкой поквартирных счетчиков теплоэнергии, с установкой радиаторов отопления с регуляторами;
сантехническая разводка по стоякам с поквартирным учетом расхода холодной и горячей воды без установки сантехнического оборудования (за исключением унитаза) и без разводки от стояков к санитарно-техническим приборам (за исключением подключения унитаза);
электротехническая разводка без установки электроплиты, без монтажа осветительных приборов, с монтажом выключателей и розеток, с установкой индивидуальных счетчиков электроэнергии;
установка оконных блоков из профиля ПВХ без установки подоконников;
остекление балконов (и/или лоджий) в соответствии с проектом;
установка деревянных входных дверей (без установки межкомнатных дверей).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы (за исключением расположенных на таких этажах нежилых помещений общественного, административного или иного назначения, не связанного с обслуживанием многоквартирного жилого дома), другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность Дольщиков, если финансирование этих объектов производилось всеми Дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода дома в эксплуатацию это товарищество создано, если такое товарищество не создано – лицу, определяемому общим собранием Дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство парковки.

Договор генерального строительного подряда заключен с СООО «СБСМОНТАЖСТРОЙ».

**Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства в эксплуатацию: первое полугодие 2012 года.**

Срок действия настоящей проектной декларации – до 17 декабря 2011 г.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18, или по телефонам: (017) 246 47 43; 246 48 89, 611 33 33 (velcom), на сайте www.dolevoe.by.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ЗА ПЕРАПРАЦОЎКУ ГРОШЫ ДАЛІЧЫЛІ. У АСТАТНІМ ЗАРПЛАТА — ЗГОДНА З РАСЦЭНКАМІ

**З адной з гаспадарак Мазырскага раёна патэлефанавала работніца сельскагаспадарчага прадпрыемства, якая паскардзілася на нізкую, па меркаванні яе самой і супрацоўніц (якія, як было чуваць у слухаўцы, увесь час паралельна з нашай гутаркай давалі ёй парады і нагадвалі пра пытанні), заработную плату. Прозвішча заяўніцы, адрас жыхарства, назва КСУПа ў рэдакцыі ёсць, але мы вырашылі не агучваць гэтыя звесткі, бо размова наша была некалькі эмацыянальнай і зацягнутай. Дакладная інфармацыя рэдакцыі была патрэбна, каб праверыць правільнасць налічэння заробку канкрэтнаму чалавеку. Даць адказ па ўсім раёне, як прасіла жанчына, папросту немагчыма: як не бывае цалкам аднолькавых людзей, так і жыццёвыя акалічнасці ў кожнага з нас свае. Таму коратка пра сутнасць звароту канкрэтнага працаўніка.**

— Доім кароў, уручную раздойваем цялушак. За гэта мала плацяць. Напрыклад, асабіста мне за верасень набегла толькі 1 мільён 100 тысяч рублёў. Неяк кіраўніцтва гаварыла, што за раздой адной галавы павінны плаціць адну суму, а на справе выплачваюць менш, — зразумелі мы са слоў заяўніцы.

Па просьбе рэдакцыі **выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА** паабяцала выехаць на месца і там разабрацца ў сітуацыі, пагутарыць і з самой нашай чытачкай, і з яе супрацоўніцамі. Праз некалькі дзён Алена Фёдараўна была гатовая даць рэдакцыі падрабязныя тлумачэнні. Адразу заўважым, што за верасень нашай гераіні дадаткова налічана і ўжо выплачана 120 тысяч рублёў — за перапрацоўку. Чамусьці пры налічэнні заробку за названы месяц гэтыя звесткі «выпалі». Што ж датычыцца апошняга, можна меркаваць па наступных лічбах.

— Малако за верасень ішло гатункам «экстра» — самым высокім па кошце. Жанчына надаіла 8 тон 388 кілаграмаў пры расцэнцы 47 430 рублёў за тону. Такім чынам, за малако ёй было налічана 397 840 рублёў. За прывагі маленькіх цялят — яшчэ 281 515 рублёў. За перапрацоўку (ваша чытачка працавала не па 8, а па 10 гадзін) — 120 080 рублёў. За вячэрнюю дойку — яшчэ 63 200 рублёў, за раздой — 376 300 рублёў, — падрабязна распавяла Алена Паўлечка. — Плюс да ўсяго гэтага работніца атрымала натуральную аплату працы (фаршам, куранятамі-бройлерамі, яйкамі) на суму 146 610 рублёў. Індэксацыя за верасень склала 414 631 рубель. А ўсяго налічаны заробак за вышэйназваны месяц гэтаму канкрэтнаму работніку склаў крыху больш за 1,8 мільёна рублёў.

За кастрычнік лічбы некалькі іншыя. Напрыклад, жанчына надаіла менш малака гатунку «экстра» — 7 тон 919 кілаграмаў (пры расцэнцы 47 430 за тону гэта 375 600 рублёў). Але былі яшчэ 434 кілаграмы малака першага гатунку (пры расцэнцы 39 194 рублі за тону гэта дадатковыя 17 010 рублёў). За перапрацоўку было налічана 79 тысяч, за прывагу цялят яшчэ 356 075 рублей, за начныя дойкі — 60 670 рублёў. За раздой выйшла больш, чым у папярэдні месяц — 731 815 рублёў. Плюс індэксацыя за кастрычнік у памеры 337 078 рублёў. У суме гэта ўжо склала 1 957 248 рублёў. «Дадайце сюды яшчэ натуральную аплату працы амаль на 150 тысяч рублёў. Пагадзіцеся, канчатковыя лічбы налічаных грашовых сродкаў ні за верасень, ні за кастрычнік нельга назваць такімі ўжо малымі, як пра тое гаварыла заяўніца, звяртаючыся ў газету», — падсумавала напрыканцы нашай размовы Алена Паўлечка. І дадала, што і самой заяўніцы, і іншым даяркам усё гэта падрабязна патлумачылі на месцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Май на ўвазе!

# НА НЕРВАХ ІГРАЕ НЕЎРОЗ

**ДЛЯ большасці з нас, не спрактыкаваных у тонкасцях ведаў аб прыродзе нервовых клетак, сцвярджэнняў накшталт «нервовыя клеткі не аднаўляюцца» і «ўсе хваробы ад нерваў» павінна быць дастаткова, каб ставіцца да сваіх нерваў беражліва і абачліва — не хвалявацца без прычыны, не звяртаць увагі на дробязі і жыць у гармоніі з сабой. Тым не менш, тая ж большасць жыве якраз наадварот і неўпрыкмет становіцца чарговымі ахвярамі самай што ні на ёсць «хваробы ад нерваў» — неўрозу.**

## ЯК З ГУСАКА ВАДА?

Неўроз адносяць да групы псіхагенных захворванняў. Аднак не варта палохацца слова «псіхагенныя». Гэта парушэнні псіхічнай дзейнасці і хваравітыя станы, якія выкліканы рознымі фактарамі, што траўмуюць псіхіку, а ў нашым наскрозь стрэсавым грамадстве гэтых фактараў звышдастаткова, таму парушэнні псіхікі сустракаюцца значна часцей, чым мы думаем. Тым не менш на прыёме ў псіхіятра аказваецца менш за чвэрць хворых на неўроз.

Часцей за ўсё неўроз — гэта наступства перагружанай псіхікі. Наша псіхіка вельмі ранімая, але арганізм да вядомых межаў здольны супраціўляцца (дарэчы, жаночыя слёзы і істэрыкі — гэта таксама ахоўная рэакцыя, такім чынам арганізм не дае сабе перагружацца, перанасычацца адмоўнай энергіяй.) Таму аднаму ўсё «як з гусака вада», а іншы ўспрымае падзеі занадта «блізка да сэрца», ды так, што сэрца пачынае даваць збой.

Неўроз можа праяўляцца самым нечаканым чынам: раздражняльнасць, незадаволенасць, пастаянны дрэнны настрой, зніжэнне апетыту, бяссонніца і дэпрэсія — гэта толькі адзін бок, больш або менш блізкі да псіхікі. Калі ж неўроз закранае вегетатыўную сістэму, разблытаць клубок хваравітых адчуванняў значна цяжэй. Часцей за ўсё гэта датычыцца страўнікава-кішачнага тракту і сэрца. Неўроз можа праяўляцца частым сэрцабіццем, «заміраннем» сэрца і да т.п. Можна хадзіць з года ў год да кардыёлага, лячыцца ад тахікардыі адпаведнымі прэпаратамі — і ўсё безвынікова.

Такім чынам, неўрозы павінен лячыць не тэрапеўт і нават не неўрапатолаг, дапамагчы чалавеку выйсці з неўрозу можа толькі псіхіятр. Але тут узнікае яшчэ адна праблема, якая ўнутры кожнага з нас: прызнацца самому сабе ў тым, што мне патрэбен псіхіятр.

Насамрэч не кожны здольны на гэты крок, зазначаюць спецыялісты. На Захадзе гэтай праблемы ўжо даўно няма, у нас жа лічаць, што псіхіятр лечыць толькі псіхічнахворых. На жаль, вельмі вялікі працэнт людзей, якім неабходна дапамога псіхіятра, ідуць па дапамогу да іншых спецыялістаў і нават празорцаў. Асаблівасці неўрозаў у тым, што чалавек усведамляе сваю хваробу і імкнецца яе пераадолець, таму ўсе неўрозы паспяхова лечацца, калі лячэнне своечасовае і адэкватнае. Ніякіх наступстваў пасля эфектыўнага лячэння яны не пакідаюць.

## «НЕРВОВЫЯ» ЛЮДЗІ

Ад знясілення нервовай сістэмы па вялікім рахунку не застрахаваны ніхто. І ўсё ж...

Для развіцця неўрозаў немалаважнае значэнне маюць індывідуальныя асаблівасці чалавека і ўмовы яго жыцця. Уражлівасць, ранімасць, надумлівасць, схільнасць да страхаў і асцярог, грубая ўладарнасць, прамалінейнасць, нецярплівасць, няўменне прыслухоўвацца да чужой думкі — усе гэтыя якасці ствараюць умовы для ўзнікнення і працяглага захоўвання адмоўных эмоцый. Эгацэнтрык, які не церпіць пярэчанняў, уступае ў канфлікт, і яго на першы погляд моцная нервовая сістэма, церпячы пастаянныя перагрузкі, хутка здае.

І, як ні дзіўна, на мяжы стрэсу знаходзяцца людзі залішне пунктуальныя, добрасумленныя, адказныя. Хіба адказнасць — адмоўная рыса? Гіпертрафіраваная адказнасць — так. Звышадказны чалавек не сувымярае свае абяцанні са сваімі магчымасцямі, стараючыся зрабіць усё ў жорсткія тэрміны, якія сам сабе ж і прызначае, — і тым самым заганяе сябе ў кут. Часам ён нават не ў стане вызначыць, што ў гэты момант галоўнае, а што — другараднае.

Бывае і прафесійная схільнасць да неўрозаў. Але найбольшае значэнне мае не столькі спецыфіка дзейнасці, колькі сувымернасць сіл і нагрузак, мера каштоўнасцяў, якія кожны вызначае для сябе. Ёсць людзі, якія паставілі сабе мэту што б там ні было дабіцца поспеху. Не лічачыся ні з чым і ні з кім, у тым ліку з сабой, яны ўпарта імкнуцца да невядомага шчасця. А любая праца, звязаная з вялікімі эмацыйнымі нагрузкамі, небяспечная нервовым расстройствам.

У значнай ступені да развіцця неўрозу схільны слабы пол. Бо эмацыйны фон жанчын больш дынамічны і нестабільны: яны часцей улюбляюцца, часцей пакутуюць, гучней праяўляюць свае эмоцыі; яны плаксівыя, ранімыя, лёгка крыўдзяцца і ў думках зацыклівающца на псіхатраўмуючай сітуацыі.

## НЕ СПРАБУЙЦЕ ЎЗЯЦЬ СЯБЕ Ў РУКІ

Імкненне пераадольваць цяжкасці нармальнае. Чалавеку здаецца, што з многім у жыцці можна справіцца без староннняй дапамогі — «узяць сябе ў рукі», стрываць, прамаўчаць або проста сысці, можна забыць, паспрабаваць выкрасліць з памяці. Трэба толькі захацець справіцца з бядой, з непрыемнасцямі. Магчыма, кожная асобна ўзятая крыўда, узрушэнне і скандал нічога не значаць. Але разам — кропля па кроплі — яны складаюцца і ў момант «Х» з кольkасці пераходзяць у якасць — менавіта так нараджаецца большасць неўрозаў. Як гэта ні дзіўна гучыць, але самае дрэннае, што можа зрабіць для сябе чалавек у стане неўрозу, — гэта паспрабаваць узяць сябе ў рукі. Калі душыць адмоўныя эмоцыі, ніяк не праяўляючы іх, то рана ці позна яны самі знойдуць сабе выхад.

Траўмаваны чалавек, які перажыў асабістае ўзрушэнне, больш за ўсё баіцца яго паўтору. Але калі ён асцярожна і клапатліва хавае свае эмоцыі, то ён наўрад ці ад іх пазбавіцца. У народных традыцыях у рытуал пахаванняў здаўна быў укладзены глыбокі псіхалагічны сэнс. Плакальшчыцы (спецыяльна запрошаныя і навучаныя жанчыны) гучна галасілі: «На каго ты мяне пакінуў?» — гэта значыць, яны гаварылі тое, што адчуваў чалавек, які гаруе, але быў не ў стане выказаць.

## НЕЎРОЗ БАІЦЦА ГАРМОНІІ

Урачы не стамляюцца паўтараць, што прафілактыка неабходная. Мы ж не стамляемся не давяраць гэтай самай прафілактыцы. У лепшым выпадку ўсе прафілактычныя мерапрыемствы заключаюцца ў прыёме вітамінаў. Аднак, як і ўсякую хваробу, неўроз лягчэй папярэдзіць, чым лячыць.

- Давайце сабе разрадку, не назапашвайце адмоўную энергію. Вызваленне ад адмоўнай энергіі — справа асабістая: адзін бярэ фарбы і малюе, другі займаецца спортам, трэці давяраецца дзённіку. Часам нават біццё посуду ў гэтым выпадку меншае зло, чым падарванае псіхічнае здароўе.
- Калі здарылася нешта дрэннае, ад чаго варта пазбавіцца (не «проста забыць», а менавіта пазбавіцца), прагаварыце гэта з кім-небудзь. Лепш, калі гэта будзе псіхааналітык, але і сяброўка на кухні — таксама не горшы варыянт. Галоўнае — не маўчыце, не накручвайце сябе і не перагружайце сваю псіхіку.
- Адпачынак і праца павінны быць абавязкова збалансаваныя. Працагалізм таксама прыводзіць да неўрозу. Трэба пераключаць разумовую дзейнасць на фізічную, як мінімум 30 хвілін у дзень павінна ісці на фізічную нагрузку, заняткі спортам.
- Сон павінен быць ад 6 да 8 гадзін на суткі. Калі сон парушаны, трэба рабіць прафілактыку паляпшэння сну немедыкаментозным спосабам: своечасова лажыцца, не слухаць гучную музыку, не наядацца перад сном, добра праветрываць пакой.
- Дадавайце ў свой рацыён больш антыстрэсавых прадуктаў. Аднаўляюць серотанін, які адказвае за спакой, такія прадукты, як тлустыя гатункі рыбы, бананы, памідоры.
- Шкадуйце сябе, адпачывайце. І лепш, калі гэта будзе сапраўдны душэўны адпачынак. Прагулкі на прыродзе куды лепш за шумную кампанію, прынамсі для вашай псіхікі.
- Не бойцеся псіхіятраў. Вітаміны і прафілактычныя мерапрыемствы добрыя, але менавіта як прафілактычныя. Калі неўроз ужо ёсць, яго трэба лячыць. Адным і вітамінамі тут не абысціся. Неўроз не з тых хвароб, якія праходзяць спантанна. Што ж датычыцца самалячэння, то неўроз не насмарк, з якім можна справіцца праз тыдзень, самалячэнне хутчэй прывядзе да ўскладненняў. Псіхіка — рэч далікатная.

Лячэнне неўрозу заўсёды комплекснае: тут і псіхатропныя прэпараты, і курс псіхатэрапіі, якая мае на мэце вырашэнне канфліктнай сітуацыі, і агульнаўмацавальныя сродкі, і фізіятэрапія. А самая простая парада псіхіятраў — не даводзьце сябе да неўрозу, жывіце ў гармоніі з сабой.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## Працагалізм падаўжае жыццё?

Людзі, якія шмат працуюць, могуць пражыць дастаткова доўгае жыццё, сцвярджаюць амерыканскія даследчыкі з Каліфарнійскага ўніверсітэта. Навукоўцы правялі даследаванне, у ходзе якога высветлілася, што такія ўласцівыя працаголікам рысы, як амбіцыйнасць, арганізаванасць і сумленнасць падаўжаюць ім жыццё на 4 гады. На думку даследчыкаў, самадысцыпліна абараняе чалавека ад шкодных звычак і робіць іх (асабліва жанчын) больш устойлівымі да стрэсаў. Такія людзі больш памяркоўныя і скрупулёзныя. Эксперты прыйшлі да высновы, што працалюбівыя людзі жывуць даўжэй, на падставе вынікаў даследавання, якое ахапіла 9 тысяч чалавек з шасці краін свету.

## Ад старэчай прыдуркаватасці выратуе добры настрой!

Французскія даследчыкі ўпэўненыя, што людзі, якія песімістычна настроены наконт стану свайго здароўя, маюць большую рызыку развіцця старэчай прыдуркаватасці. Навукоўцы правялі даследаванне, падчас якога вялося назіранне за фізічным здароўем і псіхалагічным станам 8 тысяч добраахвотнікаў немаладога ўзросту. Даследаванне паказала, што ў людзей, якія пастаянна скардзяцца на сваё здароўе, рызыка захварэць прыдуркаватасцю на 70 працэнтаў вышэйшая, чым у людзей з аптымістычным настроем.

Эксперты прыйшлі да высновы, што ад сур'ёзных захворванняў церпяць ці паміраюць заўчасна менавіта тыя людзі, якія прызвычаіліся лічыць сваё здароўе дрэнным, нават калі справы абстаяць зусім не так сумна. Часцей за ўсё такія людзі церпяць ад інфарктаў, інсультаў і іншых сардэчна-сасудзістых захворванняў, дадаюць даследчыкі.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**



# ДЗЕ ТЫ ПЛЫВЕШ, ПАЛЕСКІ ЧОВЕН?

**Жыхар вёскі Лактышы Ганцавіцкага раёна Іосіф Ленкавец яшчэ ў 2005 годзе сабраў калекцыю народных рыбалавецкіх прылад, з якіх атрымалася сапраўдная музейная экспазіцыя. Размясціў яе ў адным з пакояў вясковага цэнтра культуры і з задавальненнем вядзе экскурсіі. Адных назваў — буцкет: буц, цясла, выліўка, боўт, даўбенька, таптуха, павук, кош, венцер... Цяпер гэткія словы рэдка пачуеш ад сучасных рыбакоў. Каля 80 экспанатаў, у тым ліку і розных браканьерскіх штучак, налічвае лактышоўская галерэя, адзіная ў Беларусі, як сцвярджае сам Ленкавец.**





Навумавіч, гэтак клічуць яго аднавяскоўцы, пачынае свае экскурсіі прывітаннем-заклікам: «Даўно пара ўсім людзям знаць — прыроду трэба шанаваць!».

Паколькі вёска Лактышы ляжыць на беразе аднайменнага вадасховішча і жывуць у ёй, як кажуць, «рыбак на рыбаку», усе асноўныя экспанаты калекцыянер збіраў па суседзях. У тым ліку і забароненыя прылады, якімі гэты прыродалюб ілюструе розныя займальныя гісторыі пра тое, як часам «шануецца» родная прырода. А браканьерскіх прылад тут поўны арсенал: сеткі розных масцей, ракалоўкі, капканы на шчупакоў, электравуды.

«Многія «экспанаты» ў музей перадаюць рыбінспекцыя і інспекцыя па ахове навакольнага асяроддзя. Нешта прыносяць дзеці з гарышчаў старых хат, тое-сёе знаходжу сам, — кажа Ленкавец. — А вось каб самі браканьеры аддалі нешта сваё, такога выпадку яшчэ не было».

Не хапае ў музеі сапраўднага старога чоўна, выраблeнага цяслом. Неяк зніклі яны з лактышоўскага ўжытку, аказаліся не практычныя, пагнілі пад платамі, пайшлі на дровы. Але Навумавіч не дапускае думкі, што Палессе абяднела на чаўны і спадзяецца неўзабаве ліквідаваць і гэты этнаграфічны прабел.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Ганцавіцкі раён.*

## ЦЯПЛО Ў СЭРЦЫ

**У Кіраўскім раёне збіраюць цёплыя зімовыя адзенне і абутак для маламаёмных людзей.**

**Кіраўскі раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання ў лістападзе аб'явіў дабрачынную акцыю «Абагрэй сваім цяплом». Усе, хто мае жаданне дапамагчы, могуць дастаўляць рэчы ў будынак цэнтра на вуліцы Кірава. Супрацоўніцы расказалі, што звычайна кожны дзень некалькі чалавек прыносяць адзенне і абутак, і рэчы амаль адразу ж перадаюцца людзям, якія маюць у іх патрэбу. Дапамога перш за ўсё прызначана для сем'яў, якія трапілі ў складаныя жыццёвыя сітуацыі, для састарэлых людзей і інвалідаў. Год адкрывала калядная акцыя; зусім нядаўна, у верасні, збіралі «Школьны заплечнік» для выхаванцаў шматдзетных сем'яў; цяпер добрых людзей просяць дапамагчы бедным і нямоглым сагрэцца ў халады.**

**Ілона ІВАНОВА.**

Небяспека

## АЛІЎКІ З САПСАВАНАЙ «РЭПУТАЦЫЯЙ»

**Міністэрства аховы здароўя праінфармавала зацікаўленыя міністэрствы, ведамствы і гандлёвыя арганізацыі аб недапушчэнні рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі алівак, фаршыраваных міндалём, гандлёвай маркі Bio Gaudiano (Італія). Італьянскі «далікатэс» трапіў у няміласць санітарных службаў з прычыны таго, што ў Фінляндыі былі зарэгістраваны два выпадкі захворвання людзей на батулізм, звязаныя са спажываннем у ежу прадукцыі гэтага вытворцы. Зараз вытворца адклікае з рынку сваю прадукцыю, выраблeную ў 2010—2011 гадах.**




У Беларусі выпадкі батулізму, звязаныя са спажываннем у ежу прадукцыі прамысловай вытворчасці, не рэгістраваліся, заспакойваюць медыкі. У той жа час за бягучы год на тэрыторыі краіны было зарэгістравана 15 выпадкаў гэтага захворвання. Ахвярамі батулізму сталі 19 чалавек, якія пацярпелі ад харчовых прадуктаў, прыгатаваных у хатніх умовах. Батулізм, тлумачаць медыкі, уяўляе сабой вострае, цяжкае захворванне з групы харчовых атручэнняў, якое суправаджаецца пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы, паралічам і парэзам асобных мышцаў. Захворванне ўзнікае раптоўна, пасля спажывання недабраякасных прадуктаў, што змяшчаюць батулінічны таксін — вельмі моцны яд. Гэта могуць быць марынаваныя грыбы, мясныя і рыбныя кансервы, вяндліна і каўбасы — як правіла, прыгатаваныя ў хатніх умовах. Батулатаксін актыўна выпрацоўваецца пры тэмпературы ад 15 да 37 градусаў без доступу кіслароду: такія ўмовы ствараюцца ў вялікіх кавалках мяса ці каўбас, а таксама ў герметычна закрытых шклянках. У мэтах прафілактыкі батулізму медыкі раяць насельніцтву не кансерваваць мяса і рыбу, строга захоўваць у хатніх умовах правілы стэрылізацыі слоікаў, накрывак і рэжым цеплавой апрацоўкі прадуктаў, абавязкова адбракоўваць і знішчаць бамбажныя слоікі і ні ў якім разе не набываць з рук выраблeныя ў хатніх умовах кансерваваныя мяса, рыбу, грыбы або гародніну ў герметычна закрытых слоіках з металічнымі накрыўкамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Спорт-тайм

## Кубак Палесся адкрые матч каманды Расіі на чале са скандальным Назаравым

Сёння ў гомельскім Лядовым палацы стартуе шосты розыгрыш Кубка Палесся. У спаборніцтвах, якія пройдуць з 10 па 12 лістапада, возьмуць удзел чатыры каманды: зборныя Беларусі, Даніі, Славеніі, а таксама другая зборная Расіі, якая стане дэбютантам Кубка. Прывязе каманду Расіі ў Гомель скандальна вядомы Андрэй Назараў, які трэніруе клуб КХЛ «Віцязь». Менавіта Назараў у мінулую нядзелю ўчыніў сапраўднае шоу на «Мінск-Арэне» падчас матча «Дынама» (Мінск) — «Віцязь».

Адкрыюцца спаборніцтвы якраз матчам Расія — Данія сёння ў 15 гадзін. Паводле інфармацыі на ўчарашні дзень, каля 1500 білетаў на гэты матч яшчэ не прададзены, так што ёсць магчымасць трапіць на спаборніцтвы. Галоўнае быць асцярожнымі, калі сядзець прыйдзецца якраз за лаўкай запасных зборнай Расіі. А вось білеты на ўсе матчы зборнай Беларусі, якая выступіць на турніры пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера Кары Хейкіля, ужо раскуплены.

## «Мінск-2006» лідзіруе ў групе Еўрачэленджа

Чэмпіён Беларусі па баскетболе «Мінск-2006» у першым туры папярэдняга этапу Еўрачэленджа атрымаў першую перамогу. 8 лістапада нашы баскетбалісты ва ўпартай барацьбе перайгралі нямецкі «Бон» — 79:71. Гаспадары саступалі на працягу трох чвэрцяў матча і толькі ў заключнай 10-хвілінцы здолелі пераламіць ход паядынку. Такім чынам, пакуль у групе G лідзіруюць баскетбалісты «Мінска-2006» і турэцкага «Ізміра», якія перайгралі сваіх суайчыннікаў з «Анкары».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Праекты

## БОЛЬШ ЗА 5 МЛН ЕЎРА НА БАРАЦЬБУ З АДХОДАМІ

**Грошы на ўтылізацыю пераважна бытавых адходаў, а таксама на іншыя справы па захаванні чысціні ўнікальнай беларускай прыроды будуць выдаткаваны з рэсурсаў новага сумеснага міжнароднага праекта.**

Днямі ў Мінску адбылася стартавая канферэнцыя, у якой удзельнічалі замежныя госці з розных краін (у прыватнасці, Швецыі і Грузіі), а таксама прадстаўнікі дыпламатычных місій, міжнародных і грамадскіх арганізацый экалагічнага кірунку. Хаця праект называецца даволі агульна «Садзейнічанне развіццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь», перад ім стаяць даволі канкрэтныя і вялікія задачы.

Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Анатоль Ліс адзначыў, што ў рамках праекта будуць адпрацаваны новыя падыходы з улікам замежнага досведу па ўтылізацыі цвёрдых камунальных адходаў у Мастах і Кобрыне, дзе ўжо ёсць напрацоўкі мясцовымі ўладамі ў гэтай галіне. У абодвух райцэнтрах мяркуецца стварыць новыя магутнасці па перапрацоўцы рознага смецця і бытавых адходаў.

Вольга Чаброўская, кіраўнік праекта, гаворыць, што, акрамя Мінпрыроды, ёсць і шмат іншых партнёраў. Сярод іх калектыў заказніка «Ельня», дзе будзе адкрыты асветніцкі экалагічны цэнтр. Яго мэта — інфармаванне турыстаў, наведвальнікаў, мясцовага насельніцтва аб справах заказніка па захаванні біяразнастайнасці мясцовых балот і вадаёмаў, прыцягненне грамадскасці да прыняцця экалагічна важных рашэнняў. Гэты праект, бюджэт якога складае больш за 5 мільёнаў еўра, фінансуюць Праграма развіцця ААН і Еўрапейскі саюз.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Парады

# ДРЭННАЕ НАДВОР'Е — ДОБРЫ ПАРАСОН!

## Як правільна яго выбраць?

**ВОСЕНЬСКАЯ слота ўсё часцей прымушае ўспомніць, што, адыходзячы з дому, варта было б узяць з сабой парасон. У кагосьці ён старасвецкі, у кветачкі, а хтосьці аддае перавагу кансерватыўнаму чорнаму; нехта карыстаецца адным і тым жа некалькі гадоў, а ў кагосьці парасон не вытрымлівае і сезона.**

### ТРЫВАЛАСЦЬ ЦІ ЗРУЧНАСЦЬ?

Дзве вядомыя ўсім формы парасона, кій і складны, у гэтым плане маюць кардынальныя адрозненні. Першая канструкцыя не надта кампактная: пахадзіць франтам, трымаючы ў руках стыльны доўгі парасон, можна дзень-два, а там яно надакучыць. Але ў плане даўгавечнасці і трываласці кій выйграе ў складнога без сумненняў. Спіцы ў такога парасона маюць больш простую канструкцыю, таму зламацца з-за ветру ім нашмат складаней.

Калі ж вы жадаеце разам з парасонам набыць практычнасць і зручнасць, вам трэба прыглядзецца да складных мадэляў. Летуценныя дамы, выпраўляючыся ў краму, каб выбраць парасонік, хутчэй за ўсё пад практычнасцю будуць мець на ўвазе магчымасць змясціць яго ў сваёй невялікай дамскай сумцы, што, зразумела, таксама немалаважна. Але ж складны парасон, канструкцыя якога зарыентаваная на тое, каб у непрацоўным стане быць сціснутым і незаўважным, можа хутчэй зламацца, бо каркас яго не такі трывалы. Таму радасць ад таго, што рукі вольныя, можа змыцца з чарговым дажджом са шквалістым ветрам.

### НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ?

Запытайцеся ў прадаўца, з якой тканіны парасон. Сярод мадэляў, зробленых з нейлону, вы наўрад ці знойдзеце нешта вытанчанае, бо гэта самы просты і танны матэрыял. Але затое ён не патрабуе асаблівага догляду і даволі трывалы. Поліэстэр з баваўнай — варыянт для тых, каму важны прыгожы знешні выгляд парасона. Толькі ў гэтым выпадку будзьце гатовыя аддаць немалую суму грошай. Найлепшы воданепрымальны эфект мае матэрыял эпонж і мадэлі, у якіх тканіна мае тэфлонавае насычэнне.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Звярніце ўвагу на тое, як прымацаваныя да тканіны спіцы. Больш надзейна, калі яны трымаюцца не проста на нітках, а яшчэ і на спецыяльных каўпачках. Прасачыце, каб швы былі трывалымі, без дзірачак. Праверце, ці лёгка адкрываецца парасон, ці зручны ён для вашай рукі. Калі вы пажадаеце набыць фірменны парасон, абавязкова прасачыце, ці не спрабуюць вам прадаць падробку. Сапраўдная рэч павінна мець знак вытворцы на купале, ручцы, ушытай этыкетцы, кнопцы і чахле. Таксама на вырабе пазначаецца матэрыял, з якога зроблены парасон.

### І НЕ МОКРА, І МОДНА

Парасон — не проста рэч, каб хавацца ад дажджу. Важна , каб ён падыходзіў вам па стылі. На чым жа спыніць выбар?

Восеньскую шэрань сёлета заканадаўцы парасонавай моды раяць разбавіць яркімі фарбамі. Калі вы гэтую ідэю падтрымліваеце, набудзьце сабе парасон у палявыя кветкі, восеньскія лісты ці сланечнікі. Для менш экстрэмальных аматараў моды падыдзе варыянт, калі толькі ўнутраны бок парасона ярка размаляваны, напрыклад, пад блакітныя нябёсы з хмаркамі, звонку ваш дажджавы абаронца нічым не адрозніваецца ад сваіх кансерватыўных братоў. Модныя гэтай восенню таксама парасоны з панарамнай выявай гарадоў, не губляе сваёй папулярнасці празрысты парасон і парасон у шатландскую клетку.

Калі весці размову пра моду на тэхнічна ўдасканаленыя парасоны, то тут таксама ёсць чаму падзівіцца. Вынаходнікі прыдумваюць незвычайныя рэчы. Напрыклад, парасон-метэаролаг, ручка якога перад дажджом мяняе колер, парасон з MP3-плэерам, асіметрычны парасон, які, па словах яго стваральнікаў, дзякуючы сваёй незвычайнай форме зусім не баіцца моцнага ветру.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**



КОЛЬКАСЦЬ наркаспажыўцоў дасягае рэкордных лічбаў. Пра гэта афіцыйна сігналізуюць наркалагі і навукоўцы. У той жа час опійнае насенне маку, так званыя «бубкі», можна лёгка набыць на тэрыторыі гандлёвага цэнтра, на рынку і праз наркатаксі. Чаму?

Пра гэта ў журналісцкім расследаванні «Звязды».

# З-ЗА ЧАГО ПАСТАЎКІ НАРКАТЫЧНАГА МАКУ Ў БЕЛАРУСЬ НЕ МОГУЦЬ СПЫНІЦЬ?

*Артыкулы аб гандлі «бубкамі» выходзілі на старонках нашай газеты яшчэ летась увосень (нумары за 26 і 27 кастрычніка 2010 г.).*

*Журналіст правёў кантрольныя закупкі опійнага насення маку, са схаванай камерай. Пасля пад выглядам наркамана пабываў у прытоне, дзе ўпэўніўся, як лёгка можна вырабляць з «бубак» наркатычны раствор карамельнага колеру, які потым заганяецца шпрыцом у вену.*

*Аказалася, знешне «бубкі» падобныя на звычайны харчовы мак, якім пасыпаюць булачкі. Паўлегальна «забруджанае насенне» на канец 2010 года прадавалася праз наркатаксі, гандлёвыя пункты і звычайныя кватэры барыг.*

*Эфект ад «бубак» параўноўваюць з гераінавым. У той жа час опійнае насенне маку ў нас не кваліфікуюць як наркотык. Купляй, каліся і памірай.*

*На думку некаторых афіцыйных экспертаў, рэальная колькасць «бубачных» наркаспажыўцоў у Беларусі (амаль кожны мае гепатыт, ВІЧ, па некалькі судзімасцяў) — больш як 100 тысяч (!) чалавек. Цэлая армія. І ніхто пасля выхаду папярэдняга расследавання гэтыя лічбы не аспрэчыў.*

*Была і рэакцыя з боку афіцыйных ведамстваў.*

*У канцы лютага 2011 года пры Дзяржаўным мытным камітэце Беларусі праводзілася міжведамасная нарада. Абмяркоўвалі, як паставіць заслон «бубачным картэлям», што тэрарызуюць краіну з 2004 года. Напрыклад, змаглі дамовіцца на тое, каб правяраць усе партыі маку, што ўвозяцца ў Беларусь па афіцыйных каналах.*

*Увосень 2011 года журналіст «Звязды» паспрабаваў высветліць, ці далі гэтыя меры эфект і ці ўдалося выштурхнуць «бубкі» з беларускага наркарынку?*

*Для гэтага мы паспрабавалі правесці закупкі маку ў тых месцах, дзе тарацца наркаспажыўцы.*

## Закупка 1. КІЁСК У СТАЛІЦЫ

14 верасня гэтага года я выправіўся да аднаго з гандлёвых пунктаў у раёне Камароўскага рынку. Гэта, відаць, самы вядомы «бубачны» кіёск Беларусі. Яго фотаздымкі неаднаразова з'яўляліся ў прэсе і на разнастайных інтэрнэт-форумах. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый не раз абклейвалі будыначак налепкамі «Тут прадаюцца наркотыкі».





Але і на гэты раз прадавачка-маладуха без ваганняў заяўляе, што мак ёсць. Тавар загадзя запакаваны ў поліэтыленавыя пакеты: спачатку празрыстыя, потым чорныя, каб пакупнік мог схаваць «бубкі» ад лішкі вачэй.

Узамен на 45 тысяч беларускіх рублёў (за час падрыхтоўкі расследавання кошт вырас да 60 тысяч) маладуха працягвае мне скрутак у 250 грамаў. На гадзінніку — 16:36.

Тут жа заходжу за рог і раскрываю скрутак. З выгляду — звычайнае харчовае насенне маку. На вока — амаль няма дамешкаў макавай саломы...

Паказваю набыты «тавар» былым наркаспажыўцам, якія кансультавалі падчас падрыхтоўкі гэтага расследавання.

— *Так, паўгода таму прадаваўся такі самы мак, блакітны. Чысты знешне, без дамешкаў, як гэты.*

**— І што, быў наркатычны эфект?**

— *Быў. Усё як звычайна. «Калы» па целе, «цяга»...*

## Закупка 2. «КРОПКА» НА РЫНКУ

15 верасня на тэрыторыі рынку, што ў раёне Ждановічаў, я знайшоў ужо знаёмы гандлёвы бокс, дзе раней купляў «бубкі». Наркаманы нахвальваюць тутэйшы мак.

Праўда, мяне папярэдзілі, што абы-каму «тавар» тут ужо не прадаюць — баяцца канфіскацыі (гэта самае страшнае, што сёння можа здарыцца з макавымі барыгамі ў Беларусі, крымінальная адказнасць ім зазвычай не пагражае).





**— Семак, чвэрць кіло!** — упэўнена вітаюся я з прадавачкай, якая пайшла ў бокс насыпаць тавар.

— *Якіх семак?* — насупілася прадавачка, аглядаючы мяне зверху ўніз.

**— Чвэрць кіло маку,** — упэўнена паўтарыў я.

— *65 тысяч,* — назвала яна цану.

**— Добра.**

— *А хто вас прыслаў?* — ужо спакаваўшы мак у чорны пакет, недаверліва і з кіслай усмешкай запытала прадавачка.

**— Рабяты,** — адказаў я, прыкідваючыся дурнем.

Аддаў грошы і забраў тавар.

На гадзінніку 14:44.

Мак, які мне прадалі на «кропцы», выглядаў так: дамешкаў макавай саломы відавочна шмат. Знешне такія самыя «бубкі» я закупляў падчас падрыхтоўкі леташняга расследавання.

## Закупка 3. НАРКАТАКСІ

17 верасня 2011 года пры дапамозе былога наркаспажыўца Віктара звязваемся з так званым наркатаксістам. Цягам 2011 года, па паведамленнях ГУУС Мінгарвыканкама, у сталіцы канфіскавалі 14 наркатаксі (яшчэ





па дзвюх машынах прымаюцца рашэнні). Пры дапамозе гэтых аўто па сталіцы развозіліся і рэалізоўваліся «бубкі».

Але наркагандляроў гэтыя канфіскацыі, па ўсім відаць, не надта напалохалі. Ужо праз 15 хвілін пасля тэлефанавання мы чакалі наркатаксі ва ўмоўленым месцы — ля буйнога супермаркета. Сюды ж па «бубкі» падышоў яшчэ адзін пакупнік.

Пакуль чакалі наркатаксі, абмяркоўвалі хуткае падаражанне маку і так званай «вады» — беларускага растваральніка маркі 646, пры дапамозе якога мясцовыя «бубачнікі» выцягваюць з насення опій.

Неўзабаве ля нас спыніўся стары французскі аўтамабіль, у якім знаходзіліся два барыгі — кіроўца і «касір».

**— Здароў. «Вада» ёсць?** — першай справай запытаўся былы наркаспажывец Віктар, які дапамагаў мне ў закупцы (я ў гэты час фільмую працэс на схаваную камеру).

— *Ёсць.*

**— 300 грамаў маку і адну «ваду».**

Такім чынам у 10:41 барыгі з наркатаксі перадалі нам у чорным пакеце «бубкі» і літр растваральніку маркі 646. За ўвесь тавар мы заплацілі 79 тысяч рублёў. Знешне мак аказаўся такім жа, як і падчас **закупкі 1:** без дамешкаў макавай саломы, блакітны.

## ВЫНІКІ ЭКСПЕРТЫЗЫ

Закупленае насенне маку было здадзена экспертам.

Спачатку «тавар» па просьбе рэдакцыі газеты «Звязда» правяраўся ў цэнтральнай лабараторыі Дзяржаўнай хлебнай інспекцыі на адпаведнасць стандартам. Потым Дзяржаўны экспертна-крыміналістычны цэнтр МУС Беларусі (ДЭКЦ) па просьбе рэдакцыі правяраў «тавар» на наяўнасць наркатычных рэчываў.

## Тып 1, КАНВЕРТ №996

Найперш даследавалі мак, які быў закуплены ў кіёску, што ў раёне Камароўкі.

Спецыялісты «Дзяржаўнай хлебнай інспекцыі» правяралі насенне па 10 патрабаваннях — знешнім выглядзе, колеры, вільготнасці і г.д.

Згодна з пратаколам № 5377, **мак выпрабаванні не прайшоў**. Хоць партыя была забракавана ўсяго па двух пунктах з дзесяці: *вільготнасць* (7,7%, трэба, каб паказчык быў не большы за 7,5%) *і наяўнасць дамешкаў арганічнага смецця* (0,16%, што вельмі мала). Па вялікім рахунку партыя зусім трошкі не дацягнула да неабходных стандартаў.

Вердыкт ДЭКЦ быў наступны: *«У саставе насення наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў не выяўлена»*. Аднак эксперты адзначылі: калі даследаваць сам «раствор», прыгатаваны з гэтага насення, то экспертыза з вялікай доляй верагоднасці паказала б наяўнасць апіятаў.

Даследаванне мачы наркаспажыўцоў, якія гатавалі наркотык з насення, закупленага ў тым жа месцы прыкладна ў той жа час (па іх словах), канстатуе кадэін у крыві.

## Тып 2, КАНВЕРТ №994

Насенне маку, закупленае ў раёне «Ждановічаў», аказалася куды менш замаскіраваным. Згодна з пратаколам выпрабаванняў № 5378 спецыялісты лабараторыі Дзяржаўнай хлебнай інспекцыі знайшлі шэраг парушэнняў: гэта тыпавы састаў (мелася сумесь розных тыпаў насення, што недазволена), вільготнасць (аказалася 7,7%, а трэба не больш за 7,5%), наяўнасць алейных дамешкаў (0,23%, трэба не больш за 0, 2%), наяўнасць насення блёкату (0,23%, можна не больш за 0,01%). І, што самае галоўнае, была канстатавана наяўнасць дамешкаў арганічнага смецця (3,50%).

Спецыялісты Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра канстатавалі, што дамешкі арганічнага смецця не што іншае, як макавая салома вагой 4 г. Гэтай колькасці макавай саломы хапіла б для прыгатавання «шыркі» (наркатычнага раствору з «бубак»).

Экспертыза маку, закупленага праз наркатаксі, не праводзілася. Знешне насенне выглядала гэтак жа, як і «бубкі», што былі закуплены ў раёне Камароўкі. Нават пакеты, у якія заварочвалі насенне, былі аднолькавыя.

❐ ❐ ❐

*Фактычна даследаванні паказалі, што тавар з дзвюх першых пунктаў не падлягае дзяржаўным стандартам і прыдатны для прыгатавання наркатычнага раствору. Але прыцягнуць гандляроў да крымінальнай адказнасці — немагчыма. І вось з якой прычыны...*

### *Чаму наркакропкі працягваюць нахабна працаваць на вачах у грамадзян?*

Людзі раз-пораз задаюць лагічнае пытанне: чаму кіёскі, згаданыя ў нашых матэрыялах, адкрыта функцыянуюць? Чаму барыг не кладуць тварам у асфальт?

Адказ просты. З аднаго боку, зразумела, што, па сутнасці, прадаюцца цяжкія наркотыкі. З іншага — законы такія, што само насенне маку наркатычным сродкам не прызнаецца. Толькі калі ў прытонах спажыўцы выцягваюць з насення опій, іх можна затрымліваць і судзіць. Самі ж наркагандляры, якія распаўсюджваюць атруту, як бы ні пры чым. Гандлюй і падсаджвай на іголку беларусаў. А калі на барыгу заводзяць крымінальную справу, той адмахваецца: *«Я прадаваў мак для булачак». І абвінавачванне рассыпаецца.*

З 1 кастрычніка 2010 года запрацаваў новы дзяржаўны стандарт *СТБ №2078-2010 «Мак харчовы. Тэхнічныя ўмовы»*, які забараніў любыя дамешкі смецця ў насенні маку. Яшчэ раней «бубкі» забаранілі прадаваць на рынках і ў крамах. Сачыць за выкананнем гэтых законаў упаўнаважана не міліцыя, а іншыя ведамствы. Пакараць барыг найчасцей магчыма толькі за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Аднак тыя ж падаткавікі, аказваецца, не ведаюць пра славуты наркакіёск у раёне Камароўскага рынку. Хоць пра існаванне наркакропкі вам раскажуць усе мясцовыя жыхары.

### *Якія меры супраць «бубак» прымаліся і чаму яны не спрацоўваюць напоўніцу?*

Яшчэ ў 2005 годзе, калі міліцыя даведалася пра пераарыентаванне беларускага наркарынку на «бубкі», былі відавочны і меры, як з гэтым змагацца. Але антымакавыя ініцыятывы дзіўным чынам рассыпаліся.

Толькі ў 2010 годзе былі зроблены больш-менш важкія захады па вырашэнні праблемы.

**Мера 1:** *дзяржаўны стандарт СТБ №2078-2010, які забараняе любыя дамешкі ў насенні маку.*

На новы стандарт у 2010 годзе ўскладаліся вялікія надзеі, але ён не спрацоўвае ў поўнай меры. Пракантраляваць яго выкананне амаль немагчыма. Стандарт у шэрагу выпадкаў мае рэкамендацыйны характар. І за яго парушэнне крымінальная адказнасць не прадугледжана.

**Мера 2:** *з нядаўняга часу ўсе партыі маку, якія ўвозяцца ў Беларусь, правяраюцца Дзяржаўным мытным камітэтам на адпаведнасць дзяржаўным стандартам і «наркатычную чысціню».*

Міністэрства ўнутраных спраў пракаментавала для «Звязды» эфектыўнасць гэтай меры (афіцыйная папера падпісана часовым выканаўцам абавязкаў начальніка ўпраўлення па наркакантролі Васілём Лосічам):

*«Гэтая мера з'яўляецца эфектыўнай толькі ў дачыненні да насення маку, якое паступае па афіцыйных каналах, у той час як асноўная маса насення бескантрольна паступае ў Рэспубліку праз адкрытую мяжу з Расійскай Федэрацыяй».*

Расійска-беларуская мяжа — гэта бескантрольная дзірка, праз якую наша краіна пампуецца і «бубкамі», і сінтэтычнымі псіхатропамі, і іншай кантрабандай. Таму мера таксама не спрацоўвае належным чынам, а толькі ўскладняе наркадылерам жыццё: даводзіцца везці «бубкі» толькі праз адкрытую расійска-беларускую мяжу і траціць больш грошай на паліва.

**Мера 3:** *уключэнне насення маку ў «Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў».*

Гэтая мера магла б расставіць кропкі над «і». Барыг папросту саджалі б за краты, а не давалі б мізэрныя штрафы. Усё гэта свавольства наркатаксі і наркакіёскаў хутка скончылася б.

Калі раней журналіст «Звязды» і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый прапаноўвалі разгледзець гэтую меру, некаторыя чыноўнікі круцілі пальцам каля скроні, маўляў, вы дурныя і некампетэнтныя. Пры гэтым спасылаюцца на Канвенцыю ААН 1961 года, згодна з якой насенне маку не можа быць прызнана наркатычным сродкам. Але ў той час і «бубачнай» праблемы не існавала...

Як вынікае з афіцыйных дакументаў, якія былі дасланы ў рэдакцыю «Звязды», Дзяржаўны мытны камітэт і міліцыя ў свой час падрыхтавалі сумесны зварот у Міністэрства аховы здароўя. Прапаноўвалася ўключыць опійнае насенне маку ў «рэспубліканскі пералік». Аднак увядзенне меры не адбылося.

*«...Дадаткова паведамляем, што па выніках маніторынгу работы аб'ектаў, якія месцяцца на тэрыторыі гандлёвага цэнтра* (дзе намі была зроблена **закупка 1**, — «Звязда»), праведзенага інспекцыяй МНС па Мінску ў верасні 2011 года, фактаў рэалізацыі маку харчовага не выяўлена», — пазначана ў афіцыйным адказе на зварот «Звязды» за подпісам намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко.

Разам з тым у дакуменце пазначана, што парушэнні ў сферы абарачэння маку харчовага ў цэлым па краіне фіксуюцца:

*«Так, за перыяд з 1 студзеня 2010 года па 31 жніўня 2011 года інспекцыямі МНС выяўлена 61 парушэнне заканадаўства ў дадзенай сферы дзейнасці. Прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 52 вінаватыя асобы, сума адміністрацыйных спагнанняў склала 98,4 млн рублёў. Па рашэннях судоў у даход дзяржавы перайшлі матэрыяльныя каштоўнасці і незаконна атрыманы даход на агульную суму ў 472,9 млн руб.».*

Калі скласці абедзве сумы спагнанняў па лініі падаткавікоў **за 20 месяцаў**, то атрымаецца **571,3 млн беларускіх рублёў**. Для параўнання: сёння толькі **за суткі** ў рэспубліцы абарот «бубак» складае **як мінімум 5,5 мільярда рублёў** (амаль у 10 разоў больш).

**Мера 4:** *дзяржаўная манаполія на пастаўкі маку.*

Гэтую меру прапаноўвалі мытня, міліцыя і неабыякавыя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. І такі захад мог бы вырашыць праблему.

Сёння «забруджаны» мак увозіцца на тэрыторыю Беларусі фурамі. Робяць гэта разнастайныя камерцыйныя прадпрыемствы. Калі б увялі дзяржманаполію, то «шэрыя» пастаўкі маку лічыліся б кантрабандай, за што прадугледжана крымінальная адказнасць.

Але і ўвядзенне гэтай меры развалілася. Аказваецца, такі захад не з'яўляецца мэтазгодным з-за абавязальніцтваў у межах Мытнага саюза (*«Пагадненні аб супольных мерах нетарыфнага рэгулявання» ад 25 студзеня 2008 года»*).

❐ ❐ ❐

*Як бачна, усе глабальныя меры, якія маглі вырашыць праблему з «бубкамі», альбо тармозяцца, альбо натыкаюцца на заканадаўчыя пасткі. Атрымліваецца, што абараняюць законы не грамадзян, а макавых баронаў.*

*За 2010 год каля трох дзясяткаў крымінальных спраў супраць дылераў развалілася. Пра тое ж, ці атрымаў хоць адзін барыга рэальны турэмны тэрмін, афіцыйна не паведамляецца.*

## КОЛЬКІ ЗАРАБЛЯЕ НАРКАТАКСІСТ?

На гутарку са мной пагадзіўся былы прадавец «бубак» М., на якога я выйшаў праз былых наркаспажыўцоў.

М. сцвярджае, што перастаў займацца макавым бізнэсам пасля таго, як у яго канфіскавалі машыну і ўлупілі штраф у 3,5 мільёна беларускіх рублёў.

Па словах былога наркатаксіста, закупляў ён насенне маку на складах аднаго з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў Беларусі. Закупачны кошт кілаграма складаў 30 долараў ЗША. Прадаваўся — па 40. Адпаведна навар складаў 10 долараў з кілаграма.

За працоўную змену, раз'язджаючы па сваім мікрараёне, удавалася рэалізоўваць каля 30 кілаграмаў насення. Гэта 300 долараў ЗША чыстага навару. Працаваў М. разам з напарнікам у рэжыме двое сутак праз двое сутак.

Такім чынам, за 15 працоўных змен удавалася зарабіць да 4500 долараў ЗША. Каля 500 долараў ішло на паліва і амартызацыю аўтамабіля. **Чысты прыбытак складаў 4000 долараў ЗША на чалавека.**

З-за эканамічнага крызісу сёння чысты прыбытак такога наркатаксіста складае, па ацэнках М., каля 2500-3000 долараў ЗША.

## МАКАВЫ НАРКАТРАФІК У БЕЛАРУСЬ

Прааналізаваўшы працы навукоўцаў, справаздачы Федэральнай службы Расіі па кантролі за абарачэннем наркотыкаў (ФСКН), нескладана адсачыць маршруты макавага трафіку.

Да ўвядзення ў нашай краіне дзяржаўнага стандарту СТБ №2078-2010 «забруджанае» насенне ўвозілі і з Расіі, і з Украіны, і з краін Еўрасаюза.

З другой паловы 2010 года пастаўкі ў пераважнай большасці вядуцца толькі праз адкрытую мяжу з Расіяй. Прытым увозяць цалкам гатовыя да спажывання «бубкі».

Але спачатку «забруджаны» мак трапляе ў Расію.

Алена Расінская, дырэктар Інстытута судовых экспертыз Маскоўскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі, заслужаны дзеяч навук РФ, называе краіны, адкуль здзяйсняліся найвялікшыя пастаўкі «забруджанага» маку: Чэхія, Турцыя і Нідэрланды. Па справаздачах ФСКН Расіі, да гэтага спісу варта дадаць наступныя краіны: Турцыя, Афганістан, Іспанія.

Часта «бубкі» завозяцца ўжо гатовымі, праз мора. Ці не таму найбольш неспрыяльная наркатычная сітуацыя з насеннем маку склалася ў Паўднёвай федэральнай акрузе Расіі? Але, па звестках ФСКН, часта ў Расію ўвозіцца «чысты» мак. Ужо на месцы насенне «разбадзяжваюць» з макавай саломай, якая з вялікай доляй верагоднасці кантрабандна паступае з Афганістана. Гатовую сумесь адпраўляюць і ў Беларусь.

Натуральна, прывозяць да нас і больш «прасунутыя» бубкі, у складзе якіх макавай саломы амаль няма.

У любым выпадку нашы «наркатычныя картэлі» закупляюць тавар праз маскоўскія (радзей піцерскія) склады. Такім чынам, праз адкрытую мяжу «бубкі» прывозяцца на склады беларускія.

## ХТО ЗАЙМАЕЦЦА ПАСТАЎКАМІ БУБАК?

Забруджанае насенне маку пастаўляюць дылеры розных узроўняў. Пачынаючы ад звычайных барыг найніжэйшага звяна.

Сёлета на тэрыторыі Расіі бранскія памежнікі затрымалі жанчыну, у якой былі торбы з «бубкамі» (17 кг). Была заведзена крымінальная справа. У Расіі з гэтым нашмат лягчэй.

Перапраўляюць мак і надзвычай буйныя дылеры. Пра іх ведаюць у праваахоўных органах. Так, у ліпені гэтага года начальнік упраўлення па наркакантролі ГУУС Мінгарвыканкама Канстанцін Ляшкевіч распавядаў у відэазвароце на сайце свайго ведамства пра канфіскацыі наркатаксі. Згадаў чыноўнік і пра «фуры з макам»:

*«Мы разумеем, што мак прывозіцца на фурах, мы ўсё гэта бачым і разумеем. Але ён не прадаецца непасрэдна з фуры, таму па законе мы не можам яе канфіскаваць».*

Значыць, нашы праваахоўныя органы могуць з лёгкасцю па ланцужку выйсці на буйных і найбуйнейшых дылераў. Але па законе пакараць «шышак» не атрымліваецца.

Адзін з кампетэнтных праваахоўнікаў сказаў мне пра тое, што прынамсі да ўвядзення новага дзяржаўнага стандарту партыі маку захоўваліся на складах буйнога прадпрыемства, якое мае дачыненне да аднаго з міністэрстваў...

Таксама некаторыя праваахоўнікі намякаюць, што вялізныя партыі «бубак» захоўваюцца на складах аднаго з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў краіны. Але называць прозвішчы, прадпрыемствы і гандлёвыя цэнтры на старонках газеты мы не можам — дакументы, якія пацвярджалі б прыналежнасць да наркаабароту, ніхто не паказвае, пра гэта толькі апавядаецца ў ананімнай форме.

Што б ні гаварылася, адчуваюць сябе макавыя наркадылеры ўпэўнена.

## Статыстыка

### КОЛЬКІ Ў БЕЛАРУСІ ІН'ЕКЦЫЙНЫХ НАРКАСПАЖЫЎЦОЎ?



Амаль усе наркаманы, якія колюцца ў вену — «бубачнікі».

Спецыялісты-наркалагі звычайна прыводзяць лічбы з асцярожнасцю.

Непадрыхтаваных людзей статыстыка можа напалохаць.

Але будзем абапірацца на факты.

У 2008 годзе Цэнтр маніторынгу па наркотыках Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта на падставе статыстычнага метаду «паўторнага захопу» прывёў свае лічбы па рэальных ін'екцыйных наркаспажыўцах — прыкладна 76300 чалавек. Гэта складала 1,3% ад насельніцтва рэспублікі ва ўзросце ад 15 да 54 гадоў.

Лічбы былі афіцыйна апублікаваны з пазнакай «на канец 2007 года». Больш падобныя падлікі не публікаваліся.

Але падкрэслім, што на афіцыйным уліку па краіне тады стаяла ўсяго каля 10500 наркаспажыўцоў — як ін'екцыйных, так і іншых.

З тае пары мінула ўжо амаль чатыры гады, цягам якіх «бубкі» працягвалі актыўна прадавацца. Колькасць спажыўцоў няўхільна расце, пра што наркалагі актыўна сігналізуюць.

Якой можа быць лічба па ін'екцыйных наркаспажыўцах сёння? Калі абапірацца на досвед Цэнтра маніторынгу па наркотыках, іх колькасць можа складаць каля 100 тысяч чалавек (на афіцыйным уліку сёння стаіць каля 13500 наркаспажыўцоў).

Эксперты з аўтарытэтных грамадскіх арганізацый (напрыклад, «Маці супраць наркотыкаў») летась называлі сваю ацэначную лічбу па ін'екцыйных наркаспажыўцах — 120 тысяч чалавек. І гэта ашаламляльная лічба, яшчэ раз нагадаю, пасля апублікавання так і не была аспрэчана. Відавочна, што цягам года колькасць ін'екцыйных наркаманаў вырасла яшчэ больш!

## ЯК АДРОЗНІЦЬ «БУБКІ» АД ХАРЧОВАГА МАКУ?

Раней у наркатычным мяшанцы было і спелае, і няспелае насенне, меліся дамешкі макавай саломы. На смак увесь гэты мікст быў гаркаваты.

Сёння наркатычнае насенне яшчэ больш «прасунутае» і мала чым адрозніваецца ад харчовага маку. Дамешкі саломы мінімальныя, а колер насення найчасцей блакітны. На смак гарката не адчуваецца.

Але з аднаго кілаграму такога опійнага насення, якое нават экспертыза не прызнае наркотыкам, з дапамогай растваральніку і іншых інгрэдыентаў можна лёгка прыгатаваць дозу «ядзернага» наркотыку, які па ўздзеянні замяняе гераін.

Па словах наркаспажыўцоў, «зварыцца» яны могуць і з харчовага маку. Толькі замест 250-300 грамаў насення патрэбна каля двух кілаграмаў.

На пачатак лістапада гэтага года кілаграм бубак у сталіцы каштуе ў сярэднім 220 тысяч беларускіх рублёў.

## У ЯКУЮ ТАРУ ФАСУЮЦЬ МАК ПАДЧАС БУЙНЫХ ПАСТАВАК?

Рэдакцыя «Звязды» атрымала афіцыйныя паперы з Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі. У дакуменце сказана ў тым ліку і пра «бубачную» кантрабанду.

У 2010 годзе на мяжы з Літвой праверылі фуру «ДАФ», якая належала расіянам. Кіраваў машынай беларус. Па дакументах перавозілася «капуста белая, свежая». Замест агародніны знайшлі 400 папяровых мяхоў з насеннем маку. Кожны мех важыў 25 кг. Адсеялі макавую салому, вага якой склала 253 кг.

Праз некалькі месяцаў на беларуска-літоўскай мяжы затрымалі фуру «ДАФ», якая належала польскай транспартнай кампаніі. Па дакументах перавозіліся яблыкі. На справе ў прычэпе знайшлі 470 мяхоў маку па 25 кг кожны. Вага макавай саломы склала 660 кг.

## ВЫСНОВЫ

❐ Наркатычны мак працягвае свабодна прадавацца.

❐ Вытворцы «бубак» ужо навучыліся рабіць такі тавар, які знешне амаль не адрозніваецца ад харчовага маку. Хоць раней лічылася, што наркатычны эфект дае выключна макавая салома. Але гэта журналісцкае расследаванне даказвае, што наркаспажыўцы атрымліваюць «шырку» і са знешне чыстага насення.

❐ Фактычна за сем гадоў з часу з'яўлення «бубак» на беларускім наркарынку нічога важкага ў супрацьдзеянні іх распаўсюджанню не зроблена. Колькасць ін'екцыйных наркаспажыўцоў («жывых трупаў», якія ў пераважнай большасці хворыя на ВІЧ, гепатыт і г.д.) дасягнуў крытычных паказчыкаў. Барацьбу з наркотыкамі можна было б зрабіць «фішкай» нашай праваахоўнай сістэмы. У плане забароны сінтэтычных псіхатропаў мы ў дзясятцы лепшых краін свету. Гераін у Беларусь амаль не даходзіць, какаіну таксама няшмат. Але «бубачная» праблема засланяе ўсе дасягненні.

**Яўген ВАЛОШЫН,**
**загадчык аддзела журналісцкіх расследаванняў.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке | |
|---|---|---|
| | **лот № 1** | **лот № 2** |
| | в районе ул. Богданчука и ул. Васнецова площадью 0,8500 га | в районе кинотеатра «Беларусь» по ул. Советской площадью 0,1334 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство второй очереди индивидуальной застройки | строительство объекта общественного питания и торговли с сохранением действующего водного объекта как сооружения для культурно-просветительного и зрелищного назначения |
| **Срок аренды земельного участка** | **5 лет** | **5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | - здания, сооружения и многолетние насаждения, находящиеся в собственности граждан по ул. Богданчука, 86, 88, 90, 92, 98, 100, 102, 104/1, 106, 108 и 110 | - нежилое здание и сооружения КУП «Брестгорсвет»; - благоустройство КУП «Брестское ДЭП» |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой.** | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **74 766 903** | **137 016 840** |
| **Сумма задатка (руб.)** | **7 470 000** | **13 700 000** |
| **Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, тех.условий и АПЗ (руб.)** | **7 950 087** | **3 573 673** |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)** | **146 536 918** | **590 901 000** |

**Победитель аукциона обязан:**
**- произвести** возмещение расходов, понесенных городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объектов в размере 7 950 087 (семь миллионов девятьсот пятьдесят тысяч восемьдесят семь) рублей;
**- заключить** в течение 10 рабочих дней с даты утверждения в установленном порядке акта выбора места размещения земельного участка с Брестским городским исполнительным комитетом предварительный договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений);
**- приступить** к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения предварительного договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

**Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка; **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. **Задаток в размере до 10% от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.**

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462**. В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.
**Победитель аукциона обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации, тех.условий и АПЗ; ● заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка и договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) после выполнения условий, связанных с изъятием земельного участка, в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); ● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским горисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 16 декабря 2011 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 10.11.2011 г. до 17.30 12.12.2011 г.**
**по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

